ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ... З АДХОДАЎ

МС

СВАЯ СПРАВА. ЯК АТРЫМАЦЬ СУБСІДЫЮ?

4

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 ЛЮТАГА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 30 (29144)

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр АЎРАМЕНКА, начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва:

«Адна з першачарговых задач у жыллёвым будаўніцтве Беларусі на сённяшні дзень — у максімальна кароткія тэрміны забяспечыць квадратнымі метрамі шматдзетныя сем'і. Яшчэ на пачатак 2019 года агульная чарга была больш за 660 тысяч маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Па шматдзетных сем'ях, паводле звестак рэгіёнаў, на кастрычнік 2019 года — 37,9 тысячы. Пры гэтым летась забяспечана жыллём больш за 10 тысяч сем'яў. А накіравана на будаўніцтва больш за 14 тысяч, гэта значыць частка з іх атрымае ключы ўжо сёлета».

КВЕТКІ ДЛЯ САМЫХ КАХАНЫХ

Без прыгожага тавару, які прадае Алеся БАРЭЙКА, не абыходзіцца ніводнае свята. Асабліва запатрабаваны ён у Дзень закаханых. Назву гэтага тавару ведаюць усе! Ружы, хрызантэмы, ліліі, цюльпаны — дзесяць гадоў Алеся працуе ў сталічнай гандлёвай сетцы «ДорОрс», з якіх тры гады — менавіта ў кветкавай краме ў цэнтры сталіцы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАРАТКА

- Больш за 95% заяў на размарозку сямейнага капіталу звязаныя з паляпшэннем жыллёвых умоў.
- **Новы беларускі інфармацыйны тэлеканал плануецца запусціць у 2021 годзе.**
- Межы Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей зменяць.
- **Фестываль «Каложскі Дабравест» у Гродне будзе рэкордным па колькасці краін-удзельніц.**
- Прыкладныя этычныя правілы для педагогаў апублікаваныя на сайце Мінадукацыі.
- **У 15 сем'ях Гомельскай вобласці ў 2019 годзе нарадзілася шостае дзіця.**
- Дом сумеснага пражывання для пажылых людзей і інвалідаў адкрылі ў Белаазёрску.

Фінансы

Стрымаць інфляцыю ў межах 4—5 % нам па плячы

Як мы ўжо паведамлялі, з 19 лютага стаўка рэфінансавання зніжаецца з 9 да 8,75 % гадавых, стаўка па крэдыце авернайт — з 10 да 9,75 % гадавых, стаўка па дэпазіце авернайт — з 8 да 7,75 % гадавых. Адпаведнае рашэнне прынята праўленнем Нацыянальнага банка краіны па выніках пасяджэння па грашова-крэдытнай палітыцы, заявіў старшыня праўлення Нацбанка Павел КАЛАУР на брыфінгу ў сераду.

Ключавыя фактары, якія браліся пад увагу

Кіраўнік галоўнага банка краіны адзначыў, што на працягу гэтага года інфляцыя будзе знаходзіцца ў межах устаноўленага мэтавага арыенціру — 5 працэнтаў. У прагнозе ўлічаны запланаваны рост рэгуляваных цэн і тарыфаў, які будзе апярэджваць павелічэнне агульнага ўзроўню цэн. Пры гэтым фундаментальныя фактары, абумоўленыя станам нацыянальнай эканомікі і мерамі макраэканамічнай палітыкі, сфарміравалі аснову для забеспячэння ўмеранага характару інфляцыйных працэсаў.

«Па выніках 2019 года прырост спажывецкіх цэн склаў 4,7 % пры мэтавым параметры 5 %. Гэта крыху ніжэй, чым мы ацэньвалі. У сваю чаргу, базавая інфляцыя запаволілася да 3,5 % і захаваецца паблізу гэтага ўзроўню на працягу 2020 года», — адзначыў Павел Калаур.

СТАР. 2

Камунальныя стасункі

ЖЫВАЯ ПРАБЛЕМА

Прадпрыемствы ЖКГ займаюцца адловам беспрытульных жывёл. Але ці павінны яны гэта рабіць?

Летась у Мінскай вобласці адлавілі больш за пяць тысяч бадзяжных жывёл, толькі 203 з іх знайшлі свой дом. Толькі ўявіце сабе, як лічбы адлову павялічваюцца ў маштабах усёй краіны! І як яны маглі б паменшыцца, калі б кожная служба займалася сваёй справай...

АДСУТНАСЦЬ РЭСУРСАЎ

У Беларусі адлоў беспрытульных жывёл рэгулюецца пастановай Савета Міністраў — мясцовыя ўлады вызначаюць спецыялізаваныя арганізацыі, якія будуць займацца гэтым пытаннем у пэўным населеным пункце. У большасці выпадкаў сярод іх аказваюцца прадпрыемствы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Пры гэтым кожны выезд брыгады ажыццяўляецца за іх сродкі, а кампенсацыю з бюджэту яны атрымліваюць толькі праз некаторы час.

Напрыклад, большасць камунальнікаў Мінскай вобласці (17 з 22 раёнаў. — ***«Зв.»***) адлоўліваюць жывёл самастойна, але некаторыя з іх дэлегуюць гэтыя абавязкі сталічнаму КВУП «Фаўна горада». Якое, дарэчы, таксама ўваходзіць у сістэму ЖКГ. Некаторыя арганізацыі ўтрымліваюць жывёл у сямі спецыялізаваных пунктах, якія дзейнічаюць на Міншчыне, а хтосьці адпраўляе іх у Мінск.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НАМ ЁСЦЬ КУДЫ РАСЦІ, АСАБЛІВА Ў СФЕРЫ ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІН»

Адбыліся перагаворы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і кіраўніка Федэральнага дэпартамента замежных спраў Швейцарскай Канфедэрацыі Іньяцыа Касіса

Шматбаковая дыпламатыя, знешнегандлёвая дзейнасць, перавага машынабудавання ў прамысловасці, развітая сельская гаспадарка, прыгожая прырода і безліч азёр — у Беларусі і Швейцарыі больш агульнага, чым здаецца на першы погляд. Часам нашу краіну называюць усходнееўрапейскай Швейцарыяй, у асноўным з-за палітычнай пазіцыі ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і нейтралітэту ў канфліктах. Але ці дастаткова гэтых рыс падабенства для сяброўства з дакладнасцю швейцарскіх гадзіннікаў?

З агульнага пачаў сустрэчу і Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу, што Беларусь называюць усходняй Швейцарыяй. І ён не супраць. Такі статус Швейцарыя заслужыла дзякуючы сваёй палітыцы, пастаяннаму нейтралітэту і прыстойнасці ва ўзаемаадносінах з іншымі дзяржавамі. «Праўда, ёсць невялікія адрозненні. Мы краіна лясная, раўнінная, з вялікай колькасцю водных рэсурсаў, — звярнуў увагу кіраўнік нашай дзяржавы. — У вас, што прыцягвае заўсёды людзей, вельмі шмат добрых, даступных гарналыжных курортаў, горы вельмі ўпрыгожваюць вашу краіну. На жаль, у нас гэтага няма».

Ён адзначыў, што паміж дзяржавамі былі і ёсць добрыя палітычныя стасункі. Пры такім фундаменце неабходна звярнуць увагу на эканамічныя пытанні. «Нам ёсць куды расці, асабліва ў сферы гандлёва-эканамічных адносін. ***Эканоміка — галоўнае. Мы гатовы (і такія прыклады ёсць) даць швейцарскаму бізнесу самыя выгадныя ўмовы для інвеставання»***, — сказаў Прэзідэнт.

Добрым крокам для пашырэння супрацоўніцтва стане і абмен пасольствамі. Учора кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў Іньяцыа Касіс і Уладзімір Макей узялі ўдзел у цырымоніі адкрыцця пасольства Швейцарыі ў Мінску, якое з 2007 года было прадстаўлена толькі адзяленнем.

«Ваш візіт вельмі важны, ён своечасовы. І, упэўнены, ***ён дасць штуршок паглыбленню нашага супрацоўніцтва»***, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Іньяцыа Касіс падзякаваў Прэзідэнту за магчымасць сустрэчы і расказаў пра традыцыю падчас наведвання іншых дзяржаў: перад перагаворамі з палітыкамі ён праводзіць сустрэчу са швейцарскай дыяспарай. «Для мяне было вельмі важна даведацца пра іх адчуванні ад Беларусі, іх успрыняцце Беларусі. І ўсе яны ў адзін голас высока хвалілі і высока ацэньвалі тое развіццё, тую дынаміку, якая назіраецца ў Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік Федэральнага дэпартамента замежных спраў Швейцарскай Канфедэрацыі.

Іньяцыа Касіс пагадзіўся, што ў краін шмат агульнага, у тым ліку і выклікаў. Яны знаходзяцца ў падобнай геапалітычнай сітуацыі — акружаны буйнымі, моцнымі суседзямі. Для Швейцарыі гэта Германія, Францыя, Італія, для Беларусі — Расія, Польшча.

«Нам трэба замацоўвацца, абараняць сваё месца ў гэтым акружэнні. І вельмі важны пункт для гэтага — развіццё дыпламатыі, пошук свайго месца на сусветнай арэне, — паведаміў кіраўнік Федэральнага дэпартамента замежных спраў Швейцарскай Канфедэрацыі. — І Беларусь нямала дасягнула ў пытаннях урэгулявання ўкраінскага крызісу».

* * *

Дарэчы, гэта першы візіт у нашу краіну афіцыйнага прадстаўніка высокага ўзроўню са Швейцарыі. Таму насычаны графік дзелегацыі апраўданы.

Раніцай Валерый Міцкевіч, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў, сустрэўся са сваім калегам Андрэасам Эбі, які з 2017 года суўзначальвае парламенцкую групу дружбы з Беларуссю. У беларускім парламенце ўжо сфарміравана новая рабочая група па супрацоўніцтве з парламентам Швейцарыі, якой кіруе Андрэй Савіных. Чакаецца, што сёлета ў Мінску адбудзецца чарговае пасяджэнне Беларуска-швейцарскага сумеснага камітэта па гандлі і эканамічным супрацоўніцтве, у якім возьмуць удзел і парламентарыі. Мерапрыемства надасць імпульс ажыўленню не толькі гандлю, але і інвестыцый.

Фота БелТА.

Уладзімір МАКЕЙ і Іньяцыа КАСІС падчас адкрыцця пасольства Швейцарыі ў Мінску.

Валерый Мацкевіч адзначыў і сумесную дзейнасць на пляцоўцы міжнародных арганізацый: «Наша работа ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ вельмі плённая. Асабліва каштоўны той факт, што швейцарскія калегі ўжо тры гады запар падтрымліваюць пазіцыю Беларусі. У тым ліку на апошняй сесіі ПА АБСЕ, дзе швейцарская дзелегацыя выступіла суаўтарам беларускай рэзалюцыі па тэматыцы стратэгічнага планавання».

Перагаворы кіраўніка Федэральнага дэпартамента замежных спраў Швейцарскай Канфедэрацыі Іньяцыа Касіса і міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея прайшлі нават у двух фарматах — «сам-насам» і пашыраным. Міністры таксама ўзялі ўдзел у цырымоніі адкрыцця пасольства Швейцарыі ў Мінску, якое размясцілася на плошчы Свабоды. З верасня ў Мінску працуе першы ў гісторыі двухбаковых адносін Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Швейцарыі ў Беларусі Клод Альтэрмат.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ У тэму

Летась тавараабарот Беларусі і Швейцарыі склаў 258 мільёнаў долараў ЗША. З іх экспарт — амаль 40 мільёнаў долараў, імпарт — 218 мільёнаў. Аснову экспарту сфарміравалі пастаўкі кузаваў для аўто, вырабы з каменю і мінеральных рэчываў, агародніна. Імпартаваліся часткі рухомага саставу, лекавыя сродкі і медыцынскае абсталяванне. Швейцарыя знаходзіцца ў дзясятцы краін — ключавых спажыўцоў беларускага рынку паслуг, займае пятае месца па колькасці прамых інвестыцый на чыстай аснове.

Стрымаць інфляцыю ў межах 4—5 % нам па плячы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уплыў фундаментальных знешніх і ўнутраных фактараў будзе спрыяць дасягненню мэтавага параметра па інфляцыі і ў сярэднетэрміновым перыядзе.

Першае, на што звярнуў увагу спікер, — знешнія ўмовы застануцца спрыяльныя для дынамікі цэн у нашай краіне. Пазітыўным фактарам тут з'яўляецца запаволенне ў 2019 годзе інфляцыі ў Расіі і нізкі рост цэн у краінах Еўрапейскага саюза. На працягу 2020 года інфляцыя ў гэтых краінах, нягледзячы на яе паступовае паскарэнне, будзе заставацца ніжэйшая за мэтавыя арыенціры.

На гэтым фоне чакаецца падтрыманне нейтральнага характару манетарнай палітыкі Банка Расіі. Працяг мяккай палітыкі Еўрапейскага цэнтральнага банка і Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША прадугледжвае захаванне нізкіх працэнтных ставак у развітых краінах. У гэтых умовах не праглядаецца ўзмацненне рызык адтоку капіталу з краін, якія развіваюцца, і, адпаведна, ціск на іх валюты, перш за ўсё на расійскі рубель.

У сукупнасці знешнія фактары па-ранейшаму будуць аказваць стрымліваючы ўплыў на рост цэн у нашай краіне на тавары, што імпартуюцца.

Другое. З боку ўнутранай эканомікі таксама не чакаецца праінфляцыйнага ціску. Чаму? Спецыялістамі прагназуецца захаванне ўмеранага спажывецкага попыту. Гэтаму будзе спрыяць збалансаваны рост заработных плат на фоне запаволення спажывецкага крэдытавання.

Разам з тым варта ўлічваць, што павелічэнне выдаткаў, у тым ліку звязанае з захаваннем сацыяльнай накіраванасці бюджэту, будзе адбывацца на фоне памяншэння валютных паступленняў. У выніку фіскальная палітыка набудзе нейтральны характар і не паскорыць інфляцыйныя працэсы. Прагназуецца, што ў сярэднетэрміновым перыядзе курс нацыянальнай валюты будзе знаходзіцца паблізу раўнавагі.

Што датычыцца рызык ва ўнутранай эканоміцы, то ў асноўным яны маюць доўгатэрміновы характар. Гэта **інфляцыйныя чаканні**. Па выніках апытанняў, запаволенне інфляцыі спрыяе іх зніжэнню. Ва ўмовах забеспячэння цэнавай стабільнасці з боку чаканняў не прагназуецца значнага дадатковага праінфляцыйнага ўплыву. Разам з тым іх павышаны ўзровень і адчувальнасць да змены цэн на асобныя групы тавараў застаюцца фактарам рызыкі.

Улічваючы сукупнасць усіх пералічаных вышэй фактараў, праўленне Нацыянальнага банка прыняло рашэнне аб зніжэнні стаўкі рэфінансавання.

Сезонны попыт і каранавірус

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды», Павел Калаур адзначыў, што цяперашняя сітуацыя на валютным рынку абумоўлена сезонным попытам. Гэты попыт «трохі скарэкціраваны перагаворным працэсам з Расійскай Федэрацыяй». Статыстыка паказвае, што па выніках студзеня насельніцтва купляла замежнай валюты больш, чым прадавала. Праўда, гэта розніца не такая істотная. Па выніках лютага Нацбанк не чакае нейкага значнага ўплыву на сітуацыю на валютным рынку.

Пры гэтым старшыня праўлення Нацбанка лічыць, што на валютным рынку сёлета валацільнасць (зменлівасць цаны) будзе большая, чым летась. «Гэта правільна для таго, каб курс быў па-сапраўднаму плаваючы. У перспектыве мы павінны перайсці да рэжыму курсу, які свабодна плавае, дзе не павінна быць нават аднадзённых згладжванняў. Нічога страшнага ў гэтым няма. Гэта ўсвядомленыя дзеянні, накіраваныя на рашэнне доўгатэрміновых праблем. Што датычыцца сітуацыі ў найбліжэйшай перспектыве, гэта будзе залежаць у тым ліку і ад таго, наколькі будуць рэалізоўвацца рызыкі, завязаныя на эпідэмію каранавіруса. Як бы то ні было, гэта прама паўплывае на сусветную эканоміку, нейкі ўскосны ўплыў акажа на Расію і на нас».

Сітуацыя будзе залежаць ад таго, наколькі хутка суб'екты гаспадарання Беларусі і Расіі дамовяцца аб цане на нафту, якая пастаўляецца. «Гэта сапраўды аказвае ўплыў на інфляцыйныя і дэвальвацыйныя чаканні насельніцтва», — удакладніў Павел Калаур.

«Утаймаванне» растэрміноўкі было ўзважаным рашэннем

Старшыня праўлення адзначыў, што навядзенне парадку з растэрміноўкамі было не спантанным, а цалкам вывераным рашэннем. «Мы за гэтым працэсам даўно сачылі, ацэньвалі выгады і выдаткі для ўсіх удзельнікаў рынку, у тым ліку для дзяржавы. Улічвалі не толькі эканамічныя, але і сацыяльныя аспекты. Гэтае рашэнне не накіравана на забарону выкарыстання картак растэрміновак, гэтае рашэнне прынята для таго, каб зрабіць працэс празрыстым і ў разумных межах». Да таго ж спікер расказаў, як ездзіў нядаўна на малую радзіму. «Там траціна пенсіянераў з сацыяльнымі пенсіямі пачынае залазіць у растэрміноўку. Кажуць — «так бясплатна». Але гэта не так», — кажа галоўны банкір.

Як паведамляла «Звязда», нядаўна Нацбанк рэкамендаваў банкам абмежаваць памеры ўзнагароджанняў, якія ім павінны выплачваць крамы за афармленне растэрміноўкі. Памер такой камісіі ў некаторых банках даходзіў да 30 %.

«Мы папрасілі іх абмежаваць памер такога ўзнагароджання да 4 %». Цяпер банкі пачалі скарачаць максімальныя тэрміны, на якія даецца растэрміноўка плацяжу. На думку Паўла Калаура, банкі сталі прымаць правільныя рашэнні. Ён прывёў у прыклад адну з камерцыйных фінансавых устаноў: «Ёсць пэўны тэрмін, калі растэрміноўка бясплатная, астатні тэрмін, калі чалавек хоча растэрміноўку на больш працяглы час, — пад пэўны працэнт у залежнасці ад тэрміну. Гэта вырашае дзве праблемы: камісія ва ўзаемаадносінах паміж банкам і гандлёвымі сеткамі знаходзіцца ў разумных межах, а чалавек здзяйсняе менш спантанныя дзеянні».

Іпатэка «прытармазіла» на юрыдычных пытаннях

Гэты механізм вырашэння жыллёвага пытання пачне працаваць, калі будзе створаны прымальны механізм рэалізацыі закладу. Пра гэта заявіў **намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей КАЛЕЧЫЦ**. Ён адзначыў, што Нацыянальны банк браў удзел у распрацоўцы праекта ўказа аб іпатэцы. «Напэўна, той праект дакумента, які ёсць, з'яўляецца нейкім кампрамісам на сённяшні дзень. Зразумела, што сёння пытанне іпатэкі ўпіраецца не столькі нават у фінансавыя пытанні і кошт рэсурсаў, колькі ў пытанні юрыдычнага характару, звязаныя з рэалізацыяй самога закладу. Безумоўна, гэты механізм павінен быць рабочым. Калі гэта ўдасца вырашыць — усё будзе працаваць».

Нагадаем, праект указа па іпатэцы распрацаваны, і ў найбліжэйшы час яго пакладуць на стол Прэзідэнту. Дакумент, у якім прапісаны пытанні развіцця будаўніцтва на ўмовах доўгатэрміновай пазыкі, грунтуецца на існуючым законе «Аб іпатэцы», але з улікам усіх праблемных момантаў. Паралельна рыхтуецца і праект указа аб будаўнічажыллёвых зберажэннях. Як чакаецца, пры рэалізацыі гэтага праекта ў Беларусі будуць улічваць магчымасці насельніцтва. Напрыклад, прапануецца будаваць у краіне больш маленькіх кватэр.

Сяргей КУРКАЧ.

Каб памяталі

У ВОІНАХ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАХ БАЧЫЦЬ СВАЙГО СЫНА

Больш за сто воінаў-інтэрнацыяналістаў Міншчыны ўзялі ўдзел у абласным урачыстым мітынгу, прысвечаным 31-й гадавіне вываду савецкіх войск з Афганістана.

Каля памятнага знака воінам-інтэрнацыяналістам, якія не вярнуліся дадому, у Вілейцы сабраліся ўдзельнікі афганскай вайны, іх жонкі, дзеці, блізкія, сваякі. Разам з імі даніну павагі загінулым аддалі старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын, кіраўнік Вілейскага раёна Алег Бегунец.

— Для Беларусі, якая панесла найбольшыя страты ў гады Вялікай Айчыннай вайны, афганская гісторыя мае адназначную ацэнку. Ніхто не мае права паставіць пад сумненне ваш гераізм, — сказаў Аляксандр Турчын.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна падкрэсліў, што для ўшанавання памяці загінулых у Беларусі шмат робіцца і на дзяржаўным узроўні, і мясцовымі органамі ўлады. Ён адзначыў, што сярод воінаў-інтэрнацыяналістаў нямала ўраджэнцаў Міншчыны. Толькі з Вілейскага раёна ў Афганістан былі накіраваны сотні маладых хлопцаў. Адзін з іх, Мікалай Каляда, які нарадзіўся ў вёсцы Ляскі, загінуў смерцю храбрых, не дажыўшы да 20 гадоў. Ён узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

— Сёння мы ўспамінаем не толькі Афганістан. Нашы суайчыннікі ў розныя часы змагаліся на баку сяброўскіх урадаў у В'етнаме, Егіпце, Сірыі, Камбоджы, Эфіопіі, Лаосе, Мазамбіку, Алжыры. Беларускія афіцэры зрабілі вялікі ўнёсак у вызваленчую барацьбу многіх народаў, — сказаў Аляксандр Турчын.

Старшыня савета грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Валерый Гайдукевіч канстатаваў, што для воінаў-афганцаў гэты дзень мае такое ж значэнне, як для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны 9 Мая: «Мы сустракаемся, успамінаем тыя падзеі, баявыя аперацыі, у якіх удзельнічалі. І, вядома, раздзяляем боль з сем'ямі, роднымі і блізкімі тых, хто не вярнуўся з вайны, а таксама тых, хто пайшоў ад нас у мірны час».

Удзельнікі мітынгу ўшанавалі памяць тых, хто не вярнуўся дадому, хвілінай маўчання. Аляксандр Турчын падвёў да помніка маці Мікалая Каляды Марфу Мікалаеўну, каб яна ўсклала кветкі. Губернатар пагутарыў з жанчынай, пацікавіўся яе жыццём, падзякаваў за сілу і мужнасць, з якой яна перанесла вялікую страту.

❍ Да ведама

У Мінскай вобласці жыве 3556 воінаў-інтэрнацыяналістаў, у тым ліку 64 інваліды ў выніку баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, і 65 членаў сем'яў загінулых ваеннаслужачых. На 1 лютага сацыяльную дапамогу атрымалі 714 удзельнікаў баявых дзеянняў і сем'яў загінуўшых у памеры больш за 42 тысячы рублёў.

Марфа Мікалаеўна прызналася, што яна заўсёды чакае сустрэч з воінамі-інтэрнацыяналістамі, у якіх бачыць свайго сына.

У межах мерапрыемства прайшоў тэматычны круглы стол, дзе былі абмеркаваны ў тым ліку і пытанні сацыяльнай падтрымкі воінаў-інтэрнацыяналістаў. Яркім момантам стала канцэртная праграма «Няхай памяць сэрца гаворыць». А ва ўстановах адукацыі раёна адбыліся ўрокі мужнасці.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

❍ Блізкая ўлада

РАШЭННЕ ПЫТАННЯ — НА МЕСЦЫ

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі, якія ўжо не першы год праводзяцца па распараджэнні Прэзідэнта і дапамагаюць людзям вырашаць надзённыя пытанні на месцах, пройдуць у суботу, 15 лютага ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.

На званкі жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:

* намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
* намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
* старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;
* першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;
* намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
* намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;
* кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

Люты адмяняецца

У панядзелак да нас завітае надвор'е вясны — будзе 5—11 цяпла

Не было да гэтага зімы, і канцоўка сезона снегам і марозам не парадуе. Вось і наступнымі днямі заходняя вятры будуць пастаўляць у глыб кантынента цёплае вільготнае акіянічнае паветра, якое ўтрымлівае ў большасці дзяржаў Еўропы, у тым ліку і ў Беларусі, далёка не лютаўскае надвор'е. Тэмпературны фон у нашай краіне на гэтым тыдні на 5—8 градусаў перавышае кліматычную норму і адпавядае апошнім чыслам сакавіка, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Так, сіноптыкі абяцаюць, што не зменіцца сітуацыя і ў найбліжэйшыя дні. Заўтра ўначы ўмовы надвор'я будзе вызначаць атмасферны фронт, а ўдзень у асноўным адаб'ецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Будзе воблачна з праясненнямі. Уначы ў паўднёвых і цэнтральных раёнах, а ўдзень пераважна па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай месцамі будуць слабыя туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Вецер пераменных напрамкаў умераны. Уначы яшчэ будзе падмарожваць да мінус 4 градусаў, а тэмпература паветра ўдзень будзе ад нуля да плюс 5 градусаў.

Вясновае надвор'е пачне «гарэзіць» па тэрыторыі нашай краіны ўжо ў нядзелю. У гэты дзень, 16 лютага, мы апынёмся пад уплывам яшчэ больш цёплай паветранай масы, якая паступае з тэрыторыі Заходняй Еўропы. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла, удзень сонейка прыгрэе і будзе 2—8 цяпла, а па паўднёвым захадзе краіны — усе 10 са знакам плюс. Месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай у асобных раёнах краіны будуць слабыя туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак умовы надвор'я будуць вызначаць атмасферныя франты ад чарговага магутнага і шырокага цыклона з цэнтрам над поўначчу Нарвегіі. У многіх краінах Еўропы, у тым ліку і ў Беларусі, чакаецца моцны парывісты паўднёва-заходні вецер. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 да плюс 6 градусаў. Удзень будзе ад плюс 5 да 11 цяпла. Такі тэмпературны фон шчыльна наблізіцца да рэкордных лютаўскіх максімумаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Легенды не паміраюць

НЕ СТАЛА «МАЁРА ВІХРА»

З Масквы прыйшла сумная навіна: на 104-м годзе пайшоў з жыцця легендарны, адзін з самых паспяховых савецкіх разведчыкаў і дыверсантаў часоў Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец вёскі Чартовічы Валожынскага раёна Аляксей Мікалаевіч Бацян.

Бог быў міласцівы да Аляксея Мікалаевіча. Толькі аднойчы ў ходзе шматлікіх перастрэлак і рукапашных баёў у тыле ворага яго твар зачапіла нямецкая куля. І гэта на фоне штодзённай рызыкі быць забітым.

«Звязда» неаднойчы расказвала пра яго поўнае неверагодных прыгод і крутых паваротаў жыццё. У тым ліку і пра, бадай, самую дзёрзкую і гучную аперацыю па выратаванні Кракава. Тады ў студзені 1945 года дыверсійная група пад кіраўніцтвам Аляксея Бацяна сарвала планы фашыстаў узарваць гэты прыгожы горад. Той подзвіг натхніў аўтара «Сямнаццаці імгненняў вясны» Юліяна Сямёнава стварыць востраскожэтны прыгодніцкі раман «Маёр Віхр». Прататыпам галоўнага героя стаў Аляксей Бацян.

Ёсць такая традыцыя — называць рэдкія алмазы імёнамі знакамітых людзей. Да 100-годдзя нашага суайчынніка — Героя Расіі Аляксея Бацяна — 100-каратнаму алмазу далі яго імя. Легенды не паміраюць.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ГЕРБ БЕЛАРУСІ СТАНЕ БОЛЬШ МІРАЛЮБНЫ

Падрыхтаваны праект закона, які карэкціруе заканадаўства аб дзяржаўных сімвалах. У геральдычным савеце пры Прэзідэнце ацанілі сімволіку і прыйшлі да высновы, што яе трэба ўдасканаліць. Выява зоркі і зямнога шара на гербе могуць змяніцца.

Згодна з агульнапрызнанымі падыходамі геральдыкі, для розных выпадкаў сімволіка можа несці іншае сэнсавае значэнне. Напрыклад, зорка мае выразныя грані, па сваім выкананні больш падыходзіць да мілітарызаванай сімволікі і мае крыху ваяўнічы характар, пракаментаваў прычыны змен **міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ**:

— Беларусь — міралюбная дзяржава, якая захоўвае нейтралітэт і ні ў якім разе не разглядае агрэсію як спосаб сваёй палітыкі. Неабходна прывесці выкананне гэтай часткі сімвала герба ў адпаведнасць з такой палітыкай.

Выкананне паралеляў і мерыдыянаў на зямным шары, што месціцца на гербе, таксама выклікае пытанні, асабліва ў выпуклай выяве, — складваецца ўражанне, што яны знаходзяцца нібы над планетай, а сама Зямля змешчана ў клетку.

— Такія нюансы выклікаюць не заўжды правільныя асацыяцыі. Таму герб павінен быць выкананы ідэальна і ўспрымацца пазітыўна. Таксама больш дасканала будуць вымаляваны некаторыя асобныя элементы, — дадаў міністр.

Калі змены ў законапраект прымуць, змена сімволікі не абыдзецца за дзень — на гэта выдзеляць пэўны прамежак часу.

Ірына СІДАРОК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сенат Італіі дазволіў прыцягнуць экс-кіраўніка МУС да суда

Нагодай стала ўведзеная летам мінулага года забарона на допуск у краіну больш за 100 нелегальных мігрантаў з караблёў італьянскай берагавой аховы Gregoretti. Раней дазвол на тое, каб завесці справу ў дачыненні да Матэа Сальвіні, даў камітэт сената па пытаннях недатыкальнасці сенатараў. Цяпер гэтае рашэнне ратыфікаваў сенат.

Як перадае агенцтва Associated Press, расследаванне можа перашкодзіць спробам Матэа Сальвіні вывесці яго партыю «Ліга» з апазіцыі і стаць прэм'ер-міністрам. Ён некалькі месяцаў заклікаў сваіх палітычных праціўнікаў накіраваць справу ў суд, дзе збіраецца даказаць, што толькі выконваў свой доўг, абараняючы краіну ад нелегальнай міграцыі. У выпадку абвінавачвання прысуду Сальвіні можа пагражаць да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Сербія створыць камісію па падзеі колькасці ахвяр агрэсіі НАТА

Такое даручэнне даў прэзідэнт Сербіі Аляксандр Вучыч, паведаміла газета «Вячэрнія навіны». Па дадзеных выдання, камісія будзе створана рашэннем урада краіны і пачне работу 24 сакавіка — у 21-ю гадавіну пачатку бамбардзіровак. У склад органа ўвойдуць прадстаўнікі войска, паліцыі, царквы. У Міністэрстве абароны Сербіі, МУС рэспублікі, а таксама ў двух спецслужбах краіны будуць сфарміраваны рабочыя даследчыя групы. Аналагічныя групы будуць створаны ў адміністрацыях аўтаномных краёў краіны і муніцыпалітэтах. Нягледзячы на тое, што з моманту агрэсіі НАТА прайшло больш за 20 гадоў, дакладныя лічбы колькасці ахвяр нападу на Югаславію невядомыя. Афіцыйныя дадзеныя вагаюцца ад 1,5 да 4 тысяч чалавек. Па дадзеных НАТА, падчас паветрана-наступальнай аперацыі «Саюзная сіла», якая доўжылася 78 дзён, авіяцыя краін альянсу здзейсніла 38 тысяч баявых вылетаў, мэтай звыш 10 тыс. з іх было нанясенне бамбавых удараў.

У Турцыі невядомы аплаціў даўгі маламаёмных

Таямнічы дабрадзей у Дзіярбакыры аплаціў у мясцовай харчовай краме ўсе запазычанасці жыхароў раёна, паведаміў тэлеканал NTV. Справа ў тым, што ў некаторых гарадах краіны месцічы з-за недахопу сродкаў часта купляюць прадукты ў доўг, запіс аб запазычанасці гаспадар уносіць у адмысловы сшытак. «Днямі да мяне ў краму прыйшоў высокі смуглы чалавек і сказаў, што хоча аплаціць усе запазычанасці мясцовых жыхароў, запісаныя ў пазыковым сшытку крамы. Пасля выплаты даўгоў на агульную суму 12,5 тысячы турэцкіх лір (больш за дзве тысячы долараў) госць вырваў і спаліў старонкі з запісамі даўгоў і сышоў», — перадае словы гаспадара крамы тэлеканал. Дарэчы, напрыканцы мінулага года ў некаторых правінцыях Турцыі з'явіўся таямнічы незнаёмец, які закрываў у раённых прадуктовых крамах даўгі маламаёмных пакупнікоў, раздаваў грошы дзецям і бедным на вуліцах.

ЖЫВАЯ ПРАБЛЕМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На Гомельшчыне працуюць прыкладна па тым жа прынцыпе, у Віцебскай вобласці ёсць 11 пунктаў часовага ўтрымання жывёл, іх адловам таксама займаюцца брыгады, якія стварылі прадпрыемствы ЖКГ. У 2019 годзе спецыялісты правялі 1602 рэйды і адлавілі больш за дзве тысячы беспрытульных жывёл.

У Брэсцкім абласным упраўленні ЖКГ асабліва адзначылі той факт, што гаспадары часта адпускаюць сваіх любімых гадаванцаў на самастойны выгул, а рабіць гэтага зусім не варта. Справа тут не толькі ў адлове, у які могуць трапіць і жывёлы з ашыйнікам, — катоў і сабак збіваюць машыны, іх могуць атруціць ці забіць. У мінулым годзе камунальнікі Брэстчыны адлавілі амаль сем тысяч беспрытульных жывёл. Часова іх утрымліваюць у спецыяльных пунктах Брэста, Пінска, Кобрына, Драгічына, Жабінкі і Століна, а хутка такія ж з'явяцца ў Баранавічах ды Іванцэвічах.

— Усё гэта робіцца, каб папярэдзіць тое ж шаленства ці другія інфекцыйныя захворванні, — тлумачыць **намеснік генеральнага дырэктара Брэсцкага абласнога ўпраўлення ЖКГ Андрэй ГАШАЎ.** — Спецыялісты выкарыстоўваюць пэўныя прэпараты і сродкі, якія не траўміруюць жывёлу.

У Магілёўскай вобласці адловам беспрытульных жывёл займаюцца толькі дзве службы — спецаўтапрадпрыемствы Магілёва і Бабруйска, якія таксама ўваходзяць у сістэму ЖКГ. Пры неабходнасці камунальнікі з раённых цэнтраў Магілёўшчыны адпраўляюць заяўкі службам і заключаюць дагавор толькі на адзін выезд спецыялізаванай брыгады.

— Гэта зручней — прадпрыемствы ЖКГ страчвалі б больш сродкаў, калі б займаліся адловам жывёл самастойна. І трэба разумець, што гэта не асноўны напрамак дзейнасці нашых арганізацый, ніхто не задумваецца, што, каб утрымліваць тых жа сабак ці катоў, карміць іх, патрэбны вялікія грошы, — лічыць **генеральны дырэктар ЖКГ Магілёўскай вобласці Андрэй РАЗГОНАЎ.**

Такой жа думкі прытрымліваюцца і на Гродзеншчыне — прадпрыемствы жыллёва-камунальнай гаспадаркі сёння з'яўляюцца падраднымі арганізацыямі і павінны займацца сваімі непасрэднымі абавязкамі — аказаннем паслуг і абслугоўваннем дамоў.

— Адразу хочацца сказаць, што галоўнае тут, як самі людзі ставяцца да жывёл — яны выпускаюць на самастойны выгул сабак, не стэрылізаваных катоў, а ўсё ж павінна пачынацца з выхавання. Вельмі добра, што валанцёры звяртаюць увагу на праблему, але, як правіла, робіцца гэта толькі на словах, і ў выніку вінаватымі аказваюцца арганізацыі ЖКГ, якія ў прынцыпе гэтым не павінны займацца, — адзначае **дырэктар Шчучынскага ЖКГ Андрэй ШКІНДЗЕРАЎ.** — Што датычыцца адлову, то ў нас створана брыгада з двух спецыялістаў. Канешне, ёсць месца, дзе мы часова трымаем жывёл, але з сабакамі існуе пэўная праблема, хаця за апошнія два гады сітуацыя не такая катастрафічная, як была раней. Калі нам сёння з бюджэту не заўсёды выдзяляюць грошы на рамонт тых жа дзіцячых пляцовак, то адкуль ім узяцца на адлоў і ўтрыманне жывёл?

ДАЎНО ВЯДОМЫ САКРЭТ

Сітуацыя ў раённых цэнтрах Беларусі складваецца прыкладна аднолькавая — адловам беспрытульных жывёл займаюцца спецыялісты прадпрыемстваў ЖКГ, і ў большасці выпадкаў ім проста не хапае сродкаў і рэсурсаў на тое, каб займацца гэтым пытаннем самастойна, стварацца неабходныя ўмовы для ўтрымання жывёл. Што тут казаць, калі далёка не ў кожным раёне мясцовыя ўлады выдзяляюць прадпрыемствам ЖКГ дастатковыя сродкі на рашэнне глабальных праблем у іх сферы (звязаных з вадой, цяплом ці каналізацыяй — **«Зв.»**). Вядома, можна стварыць прыгожую карцінку з фантанаў, кветак і ачышчаных вуліц, прычым як ад смецця, так і ад беспрытульных жывёл. За гэтай жа карцінкай ніхто не ўбачыць умоў, у якія могуць трапіць кошкі ды сабакі — жывыя істоты, якія могуць адчуваць страх і боль...

І тут не трэба дзівіцца, што ў той жа Мінскай вобласці ці на Магілёўшчыне звяртаюцца па дапамогу ў абласныя цэнтры — такім чынам камунальнікі толькі спраб уюць эканоміць грошы, якіх і так няшмат. І калі ўжо ўдавацца ў дэталі, то справа тут нават не ў сродках, а ў тым, што павінны быць дакладны раздзел абавязкаў між рознымі структурамі. Чаму ж беспрытульныя жывёлы сталі праблемай менавіта прадпрыемстваў ЖКГ? А не тых жа паляўнічых ці ветэрынарных службаў? Або арганізацый, якія павінны займацца кіраўніцтвам агульнай маёмасці ўласнікаў і аказаннем паслуг?

— У іншых краінах дзейнасць такіх кампаній, падобных да нашых прадпрыемстваў ЖКГ ці таварыстваў уласнікаў, ніяк не звязана з утрыманнем жывёл, гэтай справай займаюцца пэўныя службы, адзінае — у кожнай краіне можа па-рознаму быць арганізаваны працэс, — тлумачыць **член праўлення Міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці Генадзь КАЛЁНАЎ.** — Гэтыя кампаніі не толькі не займаюцца адловам, іх дзейнасць ніяк не суадносіцца з тым жа выгулам сабак ці парушэннямі з боку гаспадароў, якія датычацца ўтрымання хатніх жывёл. Яны ніякім чынам з гэтым не звязаны, так павінна быць і ў нас. Калі мы жадаем вырашыць праблему, то кожны павінен займацца сваёй справай, вось і ўвесь сакрэт.

* * *

Так, вельмі проста вінаваціць і нават навешваць ярлык жывадзёраў на прадпрыемствы ЖКГ. Але давайце шчыра: у нас няма ні спецыялізаваных службаў, ні адказнасці для нядобрасумленных гаспадароў, нават нама і адладжанага механізму па аплаце падаткаў за ўтрыманне хатніх жывёл... Але ж і гэта не самае галоўнае. Чаму мы самі паводзім сябе так безадказна, калі адпускаем кошак ці сабак на самастойны выгул, чаму не задумваемся пра неабходную стэрылізацыю і ўвогуле пра лёс меншых братоў? Толькі ўявіце, як маглі паменшыцца лічбы, агучаныя ў самым пачатку, калі б кожны з нас разумеў адну простую праўду — мы ў адказе за тых, каго прыручылі.

Валерыя КІСЛАЯ.

Прававая гасцёўня

СУБСІДЫЯ — ТОЛЬКІ БЕСПРАЦОЎНЫМ

А займацца ўласным бізнесам можна і ў вольны ад работы час

? Я планую займацца пашывам і рамонтам адзення ў аграгарадку, дзе жыву. Дапамажыце, калі ласка, разабрацца, ці ўваходзіць гэтая паслуга ў катэгорыю рамесніцкай дзейнасці. Магу я разлічваць на грашовую дапамогу ў выглядзе субсідыі ад дзяржавы? І як мне правільна зарэгістравацца?

Марына,
Мазырскі раён Гомельскай вобласці.

На пытанне адказвае **Святлана КАПЫЛОВІЧ, намеснік начальніка аддзела садзейнічання занятасці насельніцтва ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мазырскага райвыканкама:**

— Калі вы збіраецеся працаваць дома і рабіць заказы з матэрыялаў заказчыка, то самы выгадны варыянт у вашай сітуацыі — працаваць па спрошчаных умовах як фізічная асоба згодна з Указам Прэзідэнта № 337 «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб». У гэтым выпадку нават неабавязкова станавіцца на ўлік да нас, бо дзейнасць фізічнай асобы не субсідзіруецца.

Дзяржаўная грашовая падтрымка выдаецца, згодна з пастановай Савета Міністраў № 342 ад 7 сакавіка 2008 года, толькі на прадпрымальніцкую або рамесніцкую дзейнасць, а таксама тым, хто заняты ў сферы аграэкатурызму.

Аднак калі вы будзеце арандаваць памяшканне, паставіце вытворчыя машыны і арганізуеце атэлье са значнымі аб'ёмамі работы, то тады ёсць сэнс афармляцца як індывідуальны прадпрымальнік. Разлічваць на субсідыю ў такім выпадку можна, аднак і выдаткі будуць зусім іншыя.

Памер субсідыі у Мазырскім раёне для гараджан складае 11 бюджэтаў пражытачнага мінімуму (БМП). Цяпер гэта 2638,57 рубля, бо з 1 лютага БПМ «падрос» да 239,87 рубля. Жыхары сельскай мясцовасці могуць разлічваць на 15 бюджэтаў (3598,05 рубля). Тым, хто вырашыўся на ўласную справу на вёсцы, субсідыя большая, таму што там складаней знайсці работу на месцы.

Навучаць у службе занятасці

Карэспандэнт «Звязды» пагутарыла таксама са спецыялістамі ўпраўлення занятасці і падатковай інспекцыі, каб вывучыць пытанне больш дэталёва.

Аказваецца, каб увогуле вызначыцца, у якасці рамесніка ці індывідуальнага прадпрымальніка (ІП) лепш зарэгістравацца, трэба ведаць шмат нюансаў: чым збіраецца займацца чалавек, з якімі матэрыяламі будзе працаваць, як далей плануе прасоўваць свой прадукт, каму рэалізоўваць тавар. А каб прэтэндаваць на разгляд пытання па выдачы субсідый на адкрыццё ўласнай справы з фонду сацыяльнай абароны, неабходна мець статус беспрацоўнага.

Займаецца грашовай дапамогай на арганізацыю прадпрымальніцкай ці рамеснай дзейнасці аддзел абслугоўвання ўпраўлення занятасці або аддзел працаўладкавання раёна, дзе жыве чалавек.

Як правіла, людзі, якія спрабуюць сябе ў самастойнай працы, сумяшчаюць рамесніцтва з іншым відам дзейнасці, які прыносіць ім даход. Перш чым узнімаць пытанне, кім і як рэгістравацца, трэба папрацаваць са службай занятасці. Пасля атрымання статусу беспрацоўнага і немагчымасці працаўладкавацца на існуючыя ў раёне пасады супрацоўнікі службы занятасці будуць разглядаць прафесію чалавека, вопыт яго работы, бізнес-план, які беспрацоўны, што прэтэндуе на субсідыю, абавязкова павінен мець. Пытанне аб мэтазгоднасці выдзялення чалавеку субсідый і аказання дапамогі на арганізацыю сваёй справы вырашаецца калегіяльна.

Намерваючыся рэалізаваць сябе ў сферы самастойнай работы, чалавек павінен вывучыць нарматыўныя дакументы. У службе занятасці яму дапамогуць асвоіць нюансы прадпрымальніцкай дзейнасці, растлумачаць прававыя і фінансавыя аспекты, накіруюць на курсы. На гэтых занятках, дарэчы, нават бізнес-план могуць дапамагчы скласці.

Падаткі і работа з дому

Згодна з Указам № 337, фізічная асоба можа займацца сваёй справай па спрошчаных умовах і не рэгістравацца як ІП. Пры гэтым ёй неабавязкова мець статус беспрацоўнага і можна працаваць у вольны ад асноўнай работы час.

Зарабляць можна наступнымі спосабамі. Тынкаваць, фарбаваць, распісваць сцены; займацца дызайнам жылля, аўто, мэблі і іншых рэчаў; рабіць пакрыццё падлогі, класці печы і каміны, клеіць шпалеры; выпякаць хлебабулачныя вырабы; ствараць творы мастацтва; вырошчваць кветкі; здаваць унаём жыллё; настройваць музычныя інструменты; калоць дровы і грузіць грузы; пасвіць скаціну і рабіць шмат чаго іншага.

Непасрэдна ваша дзейнасць датычыцца сферы пашыву адзення, у тым ліку галаўных убораў, з матэрыялаў заказчыка, а таксама рамонту швейных і трыкатажных вырабаў ды галаўных убораў. Важна помніць, што і выраб, і рамонт рэчаў павінныя быць з матэрыялаў заказчыка, а аказваць паслугі па спрошчаных умовах можна толькі фізічным асобам. Затое не трэба мець касавы апарат і дакументы, якія пацвярджаюць прыём грошай.

Каб зарэгістраваць дзейнасць згодна з Указам, трэба звярнуцца з пашпартам па месцы сваёй рэгістрацыі або ў падатковую інспекцыю і атрымаць уліковы нумар. Яго пры жаданні дашлюць у асабісты кабінет, які можна стварыць на сайце Міністэрства па падатках і зборах. Штомесячную выплату адзінага падатку (за вытворчасць адзення з матэрыялаў заказчыка ў населеных пунктах Мазырскага раёна гэта 21 рубель, за рамонт адзення — 42 рублі) таксама можна дасылаць у электронным выглядзе. Першы і наступныя плацяжы пры гэтым трэба ажыццяўляць за дзень да пачатку месяца работы.

Калі нейкі месяц вы не збіраецеся працаваць, то проста не падавайце паведамленне аб аплаце. А вось калі падатак сплачаны, а папрацаваць у той месяц не атрымалася, пераразлік рабіцца не будзе, за выключэннем сыходу на бюлетэнь.

Ірына СІДАРОК.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы.

Ну і ну!

У ВЯСКОВЫМ КЛУБЕ МУЖЧЫНЕ АДМОВІЛІ Ў ПЕСНІ

Ён вярнуўся з зараджанай стрэльбай

На Століншчыне вясковая дыскатэка скончылася для 45-гадовага жыхара вёскі Кароцічы крымінальнай справай.

Усё здарылася ў мясцовым Доме культуры, куды падазраваны прыйшоў нападпітку. Ён папрасіў загадчыка клуба, які стаяў за пультам, уключыць вядомую кампазіцыю. Просьбу наведвальніка задаволілі, прычым не аднаразова. Аднак чарговае пажаданне аднавяскоўца станцаваць пад «Седая ночь» было праігнаравана, яму папросту параілі пакінуць Дом культуры, паведамляе аддзяленне міліцыі Давыд-Гарадка.

У выніку пакрыўджаны мужчына пайшоў. Праўда, неўзабаве вярнуўся з паляўнічай стрэльбай «ТОЗ-12» у руках і пачаў пагражаць загадчыку. У хулігана стрэльбу адабралі і выклікалі міліцыянераў.

Мужчына раней быў паляўнічым, аднак некалькі гадоў таму ён не падоўжыў ліцэнзію, у сувязі з чым стрэльбу ў яго забралі. Цяпер праваахоўным органам трэба будзе высветліць, як і дзе падазраваны дастаў новую, паведамілі ў МУС.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Дзень нараджэння

Надзя і Ала (гэта цяпер яны ўжо Сямёнаўна ды Іванаўна) сябравалі з самага маленства, а потым ужо і сем'ямі. Дапамагалі адна адной, разам нешта святкавалі, разам гаравалі... Так лягчэй, так зручней па жыцці і нават весялей. Да таго ж лецішчы ў гэтых кабет аказаліся побач.

...У той год і якраз там, на дачы, пад квітучымі рукамі, Сямёнаўна захацела адсвяткаваць свой дзень нараджэння. На яго — ну вядома ж — запрасіла і сяброўку з мужам, паабяцала, што пачастуе маладзенькай бульбай.

Ад яе — з кропам, з гарачай катлеткай ды ў добрай кампаніі, пад кілішак віна — не адмовіўся б, мусіць, ніхто. Вось і Іванаўна з радасцю прыняла запрашэнне, муж яе першым сказаў, што ў госці трэба паехаць загадзя...

Жонка з ім не спрачалася, а таму Карп Мікітавіч завёў сваю «капейку», пасадзіў побач жонку і павёз, прычым памалу, бо яны не спяшаліся ды і дарога на пасёлку дрэнная; дзень будні, з людзей нікога і нідзе...

Пад'язджаюць такім чынам бліжэй да сяліб — сваёй і сяброўскай — і вачам не вераць: нехта ў іхнім гародзе... Бульбу капае ці што?

— Сямёнаўна?!

— Далібог!

— Стой! Мы едзем назад, — згледзеўшы гэта, камандуе Іванаўна.

— Гэта з чаго б? — не зразумеў яе муж. — Там жа наша бульба!

— Ну і халера з ёй... Разварочвай машыну. Прыедзем вечарам, як запрашалі, — адразу да стала.

— Але чаму?

— А то не разумееш: у чалавека свята — дзень народзінаў, а мы яму «падарунак» зробім — зловім за копкай бульбы. Табе гэта трэба?

Факт, што за святочны стол пад чырвонымі ружамі госці паселі разам з гаспадарамі і бліжэй да вечара. Выпілі за дзень нараджэння Надзеі Сямёнаўны, за тое, што яна — цудоўная гаспадыня: вырасціла, бач, такую смачную разварыстую бульбу.

— Можа, і наша не горшай будзе? — наліваючы ў чаркі, прамовіў Карп Мікітавіч.

— Ну вядома, — згадзілася з ім імяніннica. — Агароды ж у нас побач, зямелька адна. Дык з чаго вашай бульбачцы горшай быць?

Потым яны пра іншае пагаманілі, паспявалі, нават патанцавалі. Добрае было святкаванне. Як і працяг сяброўства... Шчырага? Ці ўсё ж не вельмі?

Зоя Наваенка,

Глыбоцкі раён.

Няроўны шлюб?

Не ведаю, як у іншых, у мяне — год пачаўся новы, а вось сябры прыходзяць старыя: у паштовай скрынцы зноўку мая «Звязда», па пятніцах — нават з «...Народам»! Шчыры дзякуй газеце за магчымасць падзяліцца перажытым-незабытым, расказаць праўдзівыя гісторыі з жыцця сваіх блізкіх і родных.

...Нашу Зоську — невялічкую, спрытную, рыжаватую — можна было сустрэць ледзь не ўсюды. Мала хто з яе равеснікаў мог столькі працаваць і столькі... танцаваць, хоць жылося дзеўцы і цяжка: сям'я вялікая, бедная...

Для таго, каб неяк выбрацца з галечы, каб дапамагчы сваёй маці і малодшым братам, Зося падалася ў заробкі, апынулася ў Латвіі, на хутары ў аднаго досыць заможнага гаспадара. Зямлі той меў шмат, каб яе абрабляць, людзей не хапала (нават пяці дарослых сыноў) — даводзілася некага наймаць.

Праўду кажуць: хлеб батрачы, што сабачы: і сонца часам паліла, і дождж паліваў, але ж справа рабілася, працавалі разам — і батракі, і гаспадары. Прычым старэйшы з сыноў — так сталася — упадабаў нашу Зоську, вырашыў жаніцца.

Уся радня тады паўстала: як? Яна ж батрачка, чужынка?! Але Карл (так звалі дзецюка) быў чалавекам рашучым, сказаў:

— Калі не Соф'я (Зоську ён так называў), то ніхто мне больш не патрэбны.

А ў месцах тых завядзёнка: пакуль старэйшы сын не ажэніцца, малодшым таксама права не маюць.

Так што змірыліся бацькі, далі маладым кавалак зямлі, дапамаглі будавацца. Але ж няўестку па-ранейшаму не прымалі. Пры сустрэчы, як той казаў, круцілі насамі ці нават пераходзілі на іншы бок вуліцы. У гэтках выпадках хто-ніхто, відаць, крыўдаваў бы. Зося — не (ці віду не падавала?). Яна заўсёды ўсім усміхалася, з лёгкім паклонам казала свой «Добры дзень!» і вучыла мову, традыцыі, звычаі... З часам нарадзіла дзяцей, чым сцяну між раднёй разбурыла дарэшты...

Карл быў нашмат старэйшы за Соф'ю, але на хутары непадалёк ад Ліепаі яны разам пражылі доўгае і шчаслівае жыццё.

Што дапамагло? Думаю, Зосьчына мудрасць. Да многіх яна прыходзіць з гадамі, з жыццёвым вопытам, да некага — з радкамі паэта (помніце: «Якім не будзеш малайцом, — / Старайся не забыцца, / Што лепей плакаць з мудрацом, / Чым з дурнем весяліцца...»). А нехта, здараецца, прымае з малаком маці.

Таіса Несцяровіч,

м. Кляннік, Смалявіцкі раён.

Віват сяброўству!

Летась — і найбольш, вядома, у верасні — шмат казалася пра яднанне ўсходніх і заходніх беларусаў. Вось і я пра яго, пра тое ж яднанне, — на прыкладзе двух хлапчукоў, якіх лёс развёў, а потым узяў і звёў.

...Мой бацька, наколькі помню, увесь час працаваў брыгадзірам у калгасе і вельмі любіў чытаць: як толькі вольная хвіліна, — адразу ж за газету, за кніжку. З імі часам соладка засынаў... Ды не аб тым размова.

Недзе ў пачатку 90-х ён атрымаў ліст з Польшчы. Хвалявaўся — чытаў, перачытваў, пісаў і перапісваў адказ. Не абы-каму, — генералу Войска Польскага, з якім некалі, да 1939-га, пяць гадоў вучыўся ў нашай вясковай школе.

А вось далей іх шляхі разышліся: бацька застаўся дома, Косцік — сын былога асадніка — разам з сям'ёй з'ехаў на Захад. Але ж не забыўся!

Праз паўстагоддзя засумаваў, напісаў пісьмо. Што цікава, генерал майму тату — па-руску, а вось тата яму — па-польску. І тым самым, відаць, «падштурхнуў» сяброўка ў дарогу — на малую радзіму, у Беларусь.

...Трэба сказаць, што сустрэча з ёй была досыць цікавай. Так атрымалася, што мы з дзецьмі ўваліліся да бацькоў на пару гадзін пазней, і мама адразу ж са смехам стала расказваць, як вітала госця-замежніка, як шчыра той цешыўся, што вёска «нідзе не дзелася», што хата яго сяброўка амаль на тым жа месцы (хоць ужо і не тая...), што ягоны Янэк як жыў, так і жыве!

— А дзе ж ён сам? — пытаўся генерал у мамы.

— Радоўку адбывае, кароў пасе.

Госць — як мама казала — аж прысеў ад нечаканасці:

— Як гэта — пасе?.. Янэк, што, — пастух? Ён найпершым вучнем у школе быў... Я — другім і то, бач, генерал...

Прыйшлося патлумачыць, што тут да чаго, а потым госць ужо і сам прыпомніў, што радоўкі былі заўжды.

...Можа, яму і яшчэ што на памяць прыйшло б, але тут заявіліся мы — двое дарослых, двое дзяцей і Буш — кот пароды мэйн-кун. Можа, і мнагавата гасцей, але ж генерал той, дзякаваць богу, чалавекам быў простым, нос не задзіраў: мы хутка знайшлі агульную мову, а Буша ён нават палюбіў. Два сябрукі і кот часам да позняй ночы сядзелі ў дварыпад навесам, размаўлялі, смяяліся, успаміналі былое. Краем вуха я чуў — не толькі пра поспехі ў вучобе, але і пра сумесныя гульні-паходы, няўдалыя «набегі» на сады па яблыкі ды грушы, свае сімпатыі да настаўнікаў і дзяўчынак...

Ката, каб не дакучаў, мы нанач спрабавалі зачыняць у хляве, але ён рабіў падкопы і сыходзіў. Мусіць, амуры круціў з мясцовымі кошкамі.

Яму, карацей, у вёсцы добра было, нам — таксама: побач з бацькавай хатай працаваў тады Дом культуры, за 20 капеек паказвалі цікавае кіно...

Дарэчы, неяк раз, вярнуўшыся з прагляду, у хатняй паўцемры мы ўбачылі... знак вікторыі, прычым — «з падачы» генерала, які спаў (?!), «пятую кропку» пакінуўшы на падлозе, а галаву і ногі задраўшы ўверх.

Двойчы ўскрылі адну і тую ж дачу

Раней судзімых маладых людзей у вёсцы Яміцы Жыткавіцкага раёна вельмі цікавіў дачны дом, у якім усе вокны былі закрытыя рашоткамі. У іх разуменні гэта сведчыла толькі аб адным: раз так ахоўваюць, значыць, ёсць што хаваць.

І яны паспрабавалі трапіць у жыллё. Вось толькі рукамі ды падсобнымі прадметамі вырваць краты на акне так і не змаглі. Разбіўшы шкло, узялі з падаконніка электрычны танометр. Раніцай гаспадару дачы патэлефанаваў мясцовы жыхар, які і расказаў, што ў яго дом хтосьці спрабаваў пракрасціся. Следча-аператыўная група, што прыбыла на паведамленне 73-гадовага пенсіянера, зафіксавала факт спробы пранікнення.

Але праз тры дні паступіла новае паведамленне пра здзейснены крадзеж у той жа вёсцы і ад таго ж уладальніка жылля. Як аказалася, першая няўдача амаратаў чужой маёмасці не спыніла. З другой спробы невядомыя вырвалі дошкі ў сцяне каморкі і праз яе пранікліў ў дом, адкуль выкралі электрычны наждак, вуглашліфавальную машынку, партманет, грошы і пасведчанне аб рэгістрацыі транспартнага сродку.

Аператыўнікам неўзабаве стала вядома, што жыхар райцэнтра купіў наждак, вельмі падобны на выкрадзены. Калі мужчына даведаўся пра гэта, то расказаў, хто яго прадаў.

Як паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама, у выніку былі затрыманы трое сяброў 18, 20 і 21 гадоў, якія жывуць на адной вуліцы. Яны паказалі схованку ў лесе, дзе ў драўлянай скрыні захоўвалі крадзенае.

Праваахоўнікі высветлілі, што злачынная група датычная і да двух крадзяжоў паліва з бензабакаў машын жыхароў райцэнтра. Яны запраўлялі аўтамабіль аднаго з затрыманых, на якім пасля раз'язджалі па раёне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даты Падзеі Людзі

14 ЛЮТАГА

1800 год — нарадзіўся Валенцій Мельхіёравіч Ваньковіч, беларускі і польскі мастак. Прадстаўнік рамантызму ў беларускім і польскім жывапісе. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі, Літвы і Польшчы. З 1829-га жыў у Мінску. У канцы 1830-х гадоў з'ехаў з Беларусі, працаваў у Дрэздэне, Берліне, Мюнхене, Парыжы. Найбольш вядомы як партрэтыст: партрэты Пушкіна (не скончаны), Міцкевіча, Гарэцкага і інш. Напісаў манументальныя палотны «Апафеоз Напалеона», «Напалеон плача над картай Еўропы», іконы «Евангеліст Іаан», «Святая Клара». Твораў мастака захавалася вельмі мала. Яны знаходзяцца пераважна ў Англіі, Францыі, Італіі, Польшчы, Літве, Расіі.

1905 год — нарадзіўся Уладзімір Іосіфавіч Дзядзюшка, акцёр, народны артыст Беларусі (1949) і СССР (1971). Сцэнічную дзейнасць пачаў як аматар, з 1923-га працаваў у БГТ-3, з 1937-га — у Беларускім тэатры імя Янкі Купалы. Мастацтву акцёра былі ўласцівы народнасць, яркі нацыянальны каларыт, мяккі пластычны малюнак ролі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952).

1920 год — нарадзіўся Вадзім Нікіфаравіч Пазняк, грамадскі і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1966).

2005 год — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб Дзяржаўнай праграме экалагічнага аздараўлення возера Нарач на 2005—2008 гады».

1855 год — нарадзіўся Усевалад Міхайлавіч Гаршын, рускі пісьменнік. Майстар кароткага апавядання. Аўтар апавяданняў «Здарэнне», «Сігнал», «Чырвоная кветка» і інш.

1915 год — нарадзілася Марыя Мікалаеўна Мардасава, расійская спявачка, народная артыстка Расіі (1958) і СССР (1981). Герой Сацыялістычнай Працы (1987). У 1943—1972 гг. — вядучая артыстка Варонежскага рускага народнага хору, пазней — Варонежскай абласной філармоніі. Самабытная выканаўца, збіральніца і аўтар шматлікіх народных песень і прыпевак.

1935 год — нарадзіўся Рыгорэ Паўлавіч Віера, малдаўскі паэт, грамадскі дзеяч. Песні «Рамантыка» і «Меланхолія» на яго вершы выконвае Сафія Ратару.

1936 год — нарадзілася Ганна Герман, польская спявачка і кампазітар. Лаўрэат шэрагу нацыянальных і міжнародных фестываляў, у тым ліку ў Монтэ-Карла, Сан-Рэма, Неапалі, Віарэджа, Канах, Сопаце.

1995 год — на пасяджэнні Савета Міжпарламенцкай Асамблеі СНД было прынята рашэнне аб утварэнні Савета кіраўнікоў дзяржаўных інфармацыйных агенцтваў краін СНД — спецыялізаванай установы МПА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.32	18.15	9.43
Віцебск —	8.26	18.02	9.36
Магілёў —	8.23	18.05	9.42
Гомель —	8.15	18.06	9.51
Гродна —	8.47	18.31	9.44
Брэст —	8.44	18.36	9.52

Месяц

Поўня 9 лютага.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Мікалая, Пятра, Трыфана.*
К. *ПАПЯЛЕЦ. Ліліяны, Валянціна, Кірылы, Мяфодзія.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Дыетолагі зарабляюць на хлеб тым, што вучаць кліентаў не есці мучное.

Хочаце пахудзець? Найноўшае вынаходніцтва — цуда-пластыр «Страйняшка». Лепіцца на рот!

Не ем пасля шасці вечара ўжо тры дні.
Сышлі:
жывот — на 0,0001%;
бакі — на 0,0001 %;
жаданне жыць — на 99 %.

— Кажуць, Наталля з Пятром зноў сышліся?
— Так. Вось такі ў іх быў нешчаслівы развод.

— Доктар, мне здаецца, што мая жонка — алкагалічка. Я заўважыў, што чым больш у мяне ў крыві праміле спірту, тым з большаю асалодай яна п'е маю кроў.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 379.

Нумар падпісаны ў 19.30 13 лютага 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

14 лютага 2020 г. № 6 (542)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

ЗЯЛЁНЫЯ КАЛІДОРЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ў ЗОНАХ УРБАНІЗАЦЫІ

Сучасныя гарады — тэрыторыя, на якую цяпер накладваецца значна больш функцый, чым проста быць месцам для жыцця і працы. Аблічча сённяшняга горада мусіць выглядаць прыгожа, разнастайна, экалагічна і тэрытарыяльна камфортна. А яшчэ ўрбанізаваныя плошчы павінны ўмець мабільна перабудоўвацца, каб паспяваць за патрабаваннямі жыцця і людзей і заставацца пры гэтым якаснымі і карыснымі для выкарыстання. Спецыялісты паразважалі, як ушчыльніцца на асвоеных тэрыторыях без страты для асяроддзя і людзей, а таксама мадэрнізаваць гарады, арыентуючы іх на гады наперад.

стар. 4

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

Наталля КАЧАНАВА:

«Прыёмы грамадзян — важная частка работы заканадаўцаў»

Справядлівае стаўленне да людзей павінна быць у аснове работы са зваротамі грамадзян. На гэтым акцэнтаваў увагу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з парламентарыямі 5 снежня 2019 года. Людзі прыходзяць на асабістыя прыёмы і разлічваюць атрымаць канкрэтную дапамогу ў вырашэнні сваіх праблем, і яна павінна быць своечасовай і выніковай. Пра тое, як вядзецца работа са зваротамі грамадзян у Савеце Рэспублікі і з якімі пытаннямі часцей за ўсё звяртаюцца людзі, у інтэрв'ю БелТА расказала старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля КАЧАНАВА.

— Наталля Іванаўна, у апошні час сенатары прыкметна актывізавалі працу са зваротамі грамадзян. З чым гэта звязана?

— Асабістыя прыёмы грамадзян, сустрэчы ў працоўных калектывах і з насельніцтвам — важныя напрамкі дзейнасці сенатарскага корпуса, якія дазваляюць аб'ектыўна ацэньваць сітуацыю ў канкрэтных рэгіёнах нашай краіны, вызначаць, якія праблемы найбольш хвалююць людзей і як вырашаюць іх мясцовыя органы ўлады. Акрамя таго, для нас, заканадаўцаў, гэта добрая магчымасць вывучаць, як працуюць законы на справе, ці патрабуецца іх удасканаленне і ў якіх сферах.

Кіраўнік дзяржавы даклад-на акрэсліў задачы: законы павінны быць зразумелымі

Фота БелТА.

і ісці ад жыцця. І гэта вельмі правільнае патрабаванне. Па выніках прыёмаў грамадзян мы бачым тыя вузкія месцы ў заканадаўстве, над якімі неабходна працаваць. Прывяду просты прыклад. Да мяне на прыёме звярнуўся жыхар Мінска, які ў адзіночку выхоўвае дваіх непаўналетніх дзяцей. З былой жонкай ён не можа падзяліць кватэру і раз'ехацца. Жанчына злоўжывае спіртнымі напоямі. Усё гэта на вачах у дзяцей. І гэта не адзінкавы выпадак. Відавочна, што прыйшоў час уносіць карэкціроўкі ў Дэкрэт № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях», над чым мы і будзем працаваць.

стар. 2

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Расклад на заўтра

Размова Наталлі Качанавай з педагагічным актывам сталіцы атрымалася адкрытай і шчырай. стар. 2

Пад знакам Перамогі

Мерапрыемства, якое дазволіць рэгіёнам выйсці на новы ўзровень супрацоўніцтва. стар. 3

Эвалюцыя прасторы

Як трансфармаваць асяроддзе пад новыя патрэбы людзей. стар. 13

Электрычнасць з... адходаў

Чым «харчуецца» новая біягазавая станцыя, якая адкрылася побач са свінакомплексам ААТ «Белавежскі»? стар. 14

Зялёны шум

Адкуль у Брэсце сквер «банкіраў» і алея «адвакатаў»? стар. 16

«Прыёмы грамадзян — важная частка работы заканадаўцаў»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Вельмі шмат зваротаў звязана з зямельнымі адносінамі, падзелам участкаў. Паступаюць просьбы аб садзейнічанні ў вырашэнні гэтых пытанняў, а таксама прапановы, накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання і аховы зямель, абарону правоў землекарыстальнікаў. Уся гэтая інфармацыя будзе ўлічана пры карэкціроўцы Кодэкса аб зямлі.

Як вы ведаеце, цяпер шырока абмяркоўваюцца магчымыя папраўкі ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве таксама задзейнічана ў гэтай рабоце.

Гэта значыць, вядзецца жывы дыялог з грамадскасцю па многіх пытаннях заканадаўчай дзейнасці. Людзі прыходзяць да нас з добрымі ідэямі, якія сапраўды заслугоўваюць увагі.



На актыўную работу з насельніцтвам я арыентую і дэпутацкі корпус. Гэта звыш 18 тысяч чалавек, якія імкнуцца быць карыснымі свайму гораду, раёну, краіне. Неабходна максімальна выкарыстаць гэты рэсурс, перш за ўсё выбудаваць больш цеснае супрацоўніцтва з мясцовымі органамі ўлады. Тады многія рэгіянальныя пытанні можна будзе вырашаць больш эфектыўна, а самае галоўнае — своечасова. Як арганізаваць працу ў гэтым ключы, мы абмяркоўваем на сустрэчах са старшынямі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў, якія праводзяцца мной у рэгіёнах. Бачу, што дэпутаты добра валодаюць інфармацыяй аб сітуацыі на месцах, у іх нямала перспектыўных ініцыятыў.

— Калі казаць пра канкрэтныя лічбы, то колькі зваротаў паступае ў Савет Рэспублікі і з якімі пытаннямі часцей за ўсё прыходзяць людзі?

— У студзені 2020 года ў Савет Рэспублікі паступіла 406 зваротаў: 292 пісьмовыя, вусных — 114. Для параўнання: за студзень 2019 года паступіла 35 зваротаў, а за ўвесь 2019-ы — 437. Вы бачыце, рост істотны. І гэта нармальна. Калі да нас ідуць людзі, значыць, яны нам давяраюць. У той жа час аналіз зваротаў паказвае, што большасць пытанняў магло быць вырашана на месцах. І гэта сігнал мясцовым органам улады: у працы з людзьмі не павінна быць фармалізму, валакіты, адпісак. Кожны зварот патрабуе ўважлівага разгляду і канкрэтнага рашэння.

У разрэзе рэгіёнаў найбольшая колькасць зваротаў за студзень у Савет Рэспублікі паступіла ад жыхароў Мінска і Мінскай вобласці, найменшая — ад жыхароў Гродзенскай і Віцебскай абласцей.

Калі казаць пра тэматыку, то людзі прыходзяць на прыёмы ў асноўным з праблемамі, якія датычацца жыллёва-камунальнай гаспадаркі і жыллёвага фонду, землеўпарадкавання і землекарыстання, працаўладкавання, судовых спрэчак. Часта ўздымаюцца пытанні, звязаныя з работай сістэмы аховы здароўя, адукацыі, экалогіяй і аховай навакольнага асяроддзя.

— Наталля Іванаўна паколькі, мы закранулі тэму экалогіі, нельга не спытаць пра сітуацыю з высечкай Грушаўскага скверу ў Мінску. Наколькі вядома, вы асабіста выязджалі на месца, каб разабрацца ў праблеме.

— Гэтым пытаннем я займалася па даручэнні кіраўніка дзяржавы. Сітуацыя з высечкай скверу шырока абмяркоўвалася жыхарамі горада, у тым ліку ў сацыяльных сетках. І яна не засталася незаўважанай. Са старшынёй Мінгарвыканкама мы выязджалі на месца, каб дэталёва разабрацца ў тым, што адбываецца. Знойдзены прымальны варыянт вырашэння. Высечка дрэў спынена. Ва ўстаноўлены тэрмін мы праінфармуем жыхароў аб прынятых рашэннях.

— Ці будзе ў далейшым удасканальвацца работа са зваротамі грамадзян у Савеце Рэспублікі?

— Мы над гэтым працуем пастаянна. У бліжэйшы час разам з членамі Прэзідыума Савета Рэспублікі правядзём выязныя прыёмы грамадзян. Сенатары таксама працягнуць гэтую работу на месцах. У нашых графіках на бліжэйшы час — сустрэчы ў працоўных калектывах. Гэта значыць, што работа з насельніцтвам не будзе змяншаць абароты і застанецца важным складнікам дзейнасці Савета Рэспублікі.

РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

«ХАЧУ ПАЧУЦЬ АД ВАС ПРАПАНОВЫ!»

3 такімі словамі звярнулася да настаўнікаў падчас сустрэчы з педагагічным актывам сталіцы старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля КАЧАНАВА

Традыцыі, якія яднаюць

Наталля Качанава з самага пачатку сустрэчы пастаралася наладзіць шчыры і сумленны дыялог з настаўнікамі. І гэта ў яе атрымалася. Агульнавядома, што сёння ў сферы адукацыі шмат праблем, часам вострых і неадкладных. Пра іх таксама ішла гаворка. Але старшыня Савета Рэспублікі пачала размову з іншага — з таго, што аб'ядноўвае беларускую нацыю, дапамагае ўсім нам заставацца годным народам, а краіне ўпэўнена ісці наперад насуперак перашкодам і бар'ерам.

Гэта ў першую чаргу традыцыі суверэннай Беларусі, пра якія мы добра ведаем, але якія не тое што забываем, а хутчэй у віхуры паўсядзённых праблем успрымаем іх як само сабой нешта зразумелае. Калі ж кінуць погляд на даволі кароткую гісторыю незалежнай Беларусі, можна ўбачыць, як шмат дасягнута за гэтыя гады. Старшыня Савета Рэспублікі нагадала і пра нашы новыя традыцыі. Іх нямала. Гэта правядзенне Усебеларускіх народных сходаў, святкаванне Дня Незалежнасці Беларусі, гадавіны прыняцця Канстытуцыі, свята дзяржаўнага Герба і Сцяга і іншыя. Узніклі новыя спартыўныя і культурныя традыцыі. Апошнім часам наша сталіца стала месцам правядзення спаборніцтваў еўрапейскага і сусветнага ўзроўню. А да культурных традыцый Наталля Качанава аднесла, у прыватнасці, Баль выпускнікоў з удзелам кіраўніка дзяржавы, Славянскі базар, міжнародны фестываль «Александрыя збірае сяброў», дзе сустракаюцца прадстаўнікі трох брацкіх славянскіх народаў, знакамітыя артысты. І што характэрна, штогод гэта свята набывае ўсё новых сяброў з розных краін. Да 100 тысяч чалавек збіраюцца на традыцыйны вялікі гала-канцэрт у Александрыі. Ужо традыцыяй стала восеньскае свята ўраджаю «Дажынкі», дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Іх месца ў нашым жыцці і станоўчы ўплыў на грамадства цяжка пераацаніць.

Выхаваўчы патэнцыял Перамогі

На фоне спроб часткі заходніх навукоўцаў і аналітыкаў перапісаць гісторыю Другой сусветнай вайны асаблівае значэнне набывае падрыхтоўка да 75-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У сувязі з чым Наталля Качанава параіла настаўнікам як мага больш актыўна выкарыстоўваць выхаваўчы патэнцыял Вялікай Перамогі ў рабоце з моладзю, каб яна ведала праўду пра вайну і цаніла наш сённяшні дзень.

Наталля Качанава падкрэсліла, што ўсім нам, а маладым абавязкова, трэба зразумець, што мір і стабільнасць — гэта не тое, што даецца раз і назаўсёды. Сёння патрэбна кансалідацыя ўсяго грамадства, каб такая сітуацыя заставалася нязменнай. А ў маладых людзей неабходна фарміраваць пачуццё грамадзянскай адказнасці за тое, што здзейснілі старэйшыя пакаленні, выхоўваць імкненне зберагчы памяць пра Перамогу і працоўныя здабыткі.

Зарплата не павінна зменшыцца

Як публічны палітык, Наталля Качанава прадбачыла злабадзённыя пытанні аўдыторыі. Сёння, напрыклад, адна з самых абмяркоўваемых сярод работнікаў бюджэтнай сферы тэм — пра зарплату, дакладней, пра новыя падыходы ў яе налічэнні. Хоць Наталля Качанава неаднойчы ўжо выказвалася на гэты конт на

розных сустрэчах, у тым ліку і на сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў напрыканцы мінулага года. Тады яна адназначна сказала, што ніхто ў бюджэтнай сферы не павінен атрымліваць у 2020 годзе зарплату менш, чым у 2019 годзе. І папрасіла дэпутатаў трымаць гэтае пытанне на жорсткім кантролі.

Цяпер старшыня Савета Рэспублікі зноў адзначыла, што з 1 студзеня змянілася толькі сістэма аплаты працы бюджэтнікаў. Зроблена гэта выключна для спрашчэння разлікаў, але змены не павінны закрануць памер заработнай платы. «Зарплата ні ў якай меры не можа быць менш. Калі такія выпадкі ўзнікнуць, мы будзем персанальна і канкрэтна разбірацца. Возьмем гэта на кантроль», — паабяцала спікер верхняй палаты парламента.

Паводле яе слоў, у цэлым стаіць задача паступова ўзнімаць зарплату ў сферы адукацыі, педагогам школ і дзіцячых садкоў, асабліва нізкааплатным катэгорыям работнікаў, напрыклад, выхавацелям, памочнікам выхавацеляў. А ўвогуле сярэдняя зарплата бюджэтнікаў павінна складаць 80 % ад сярэдняй зарплаты па краіне. І ўрад вытрымлівае гэты паказчык.

Што хвалюе настаўнікаў?

Педагогі — гэта тыя нераўнадушныя людзі, у якіх заўсёды былі, ёсць і будуць пытанні да прадстаўнікоў улады. Відаць, сама прафесія спрыяе гэтаму. Вось і цяпер у зале Мінскага гарадскога палаца культуры, дзе сабралася больш за 600 настаўнікаў, дырэктараў сталічных школ, гімназій і іх намеснікаў, прадстаўнікоў іншых педагагічных устаноў, сустрэча перарасла ў дыялог зацікаўленых бакоў.

Гаварылі аб тым, што хвалюе настаўнікаў. У тым ліку і аб падтрымцы маладых спецыялістаў, іх ільготным крэдытаванні на набыццё кватэры, замацаванні кадраў, тэхнічным пераабсталяванні навучальных кабінетаў, арганізацыі пазашкольнай работы, гуртковў, заахвочванні тэхнічнай творчасці хлопцаў і дзяўчат, стварэнні ўмоў для навучання дзяцей з асаблівасцямі развіцця і іх далейшым працаўладкаванні пасля выпуску. Апошняе пытанне старшыня Савета Рэспублікі паабяцала разгледзець разам з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, каб такія маладыя людзі мелі магчымасць працаваць.

З залы прагучала слушная, на погляд Наталлі Качанавай, прапанова аб будаўніцтве арэнднага жылля для маладых настаўнікаў, бо гэта будзе садзейнічаць замацаванню педагогаў на месцах. Таксама падтрымала старшыня Савета Рэспублікі прапанову сваіх суразмоўцаў больш адлюстроўваць шматгранную дзейнасць настаўнікаў у сродках масавай інфармацыі, павышаць іх аўтарытэт у грамадстве.

Не аднойчы падчас сустрэчы звярталася ўвага на тое, што настаўнік — гэта апора грамадства. Ён і вучыць, і выхоўвае дзяцей, і рыхтуе моладзь да будучага жыцця. Таму і клопат дзяржавы аб настаўніку павінен быць адэкватны. Усе прапановы і пытанні былі пачутыя. Паводле слоў Наталлі Качанавай, яна абмяркуе іх са старшынёй Мінскага выканкама Анатолем Сіваком.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.
Фота БелТА.

ІНТЭГРАЦЫЯ НА ЎЗРОЎНІ

ФОРУМ ПАД ЗНАКАМ ПЕРАМОГІ

Першае пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі прайшло пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталлі КАЧАНАВАЙ.

Фота БелТА.

Яна паведаміла, што чарговы форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі вырашана прысвяціць гістарычнай спадчыне Вялікай Перамогі. Заява ў пэўнай ступені нечаканая, бо самі форумы былі задуманы як маштабныя, але ўсё ж як гаспадарчыя мерапрыемствы. Нагадаем, асноўнай мэтай першага форуму было аб'яднанне намаганняў рэгіёнаў Беларусі і Расіі дзеля гарантавання харчовай бяспекі абедзвюх краін. Мэта, як бачым, чыста эканамічная, хоць і, вядома, з палітычным падтэкстам. Адным з вынікаў форуму тады сталі рэкамендацыі па ўдасканаленні нарматыўна-прававой базы для паскарэння развіцця агрэпрамысловых комплексаў Беларусі і Расіі ва ўмовах стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза.

Гэтыя дакументы, накіраваныя на гарманізацыю і ўніфікацыю нацыянальных заканадаўстваў, і сёння спрыяюць правядзенню ўзгодненай аграрнай палітыкі, распрацоўцы перспектыўных рэсурсазберагальных тэхналогій і абсталявання для вытворчасці экалагічна чыстых відаў сельскагаспадарчай прадукцыі, нарошчванню экспартнага патэнцыялу, выпуску біялагічна паўнавартасных камбікармоў, абмену актуальнай інфармацыяй.

Другі форум рэгіёнаў ужо быў прысвечаны прамысловай палітыцы Саюзнай дзяржавы, удзелу ў яе выпрацоўцы і ажыццяўленні органамі мясцовага самакіравання. Тэма трэцяга форуму: «Рэалізацыя ўзгодненай сацыяльна-эканамічнай палітыкі ў Саюзнай дзяржаве: дасягненні, праблемы, шляхі вырашэння і перспектывы».

Усе наступныя форумы так ці інакш садзейнічалі ўзмацненню інтэграцыйнага патэнцыялу рэгіёнаў Расіі і Беларусі ў самых розных сферах. Увогуле гэтыя сустрэчы прадэманстравалі даволі высокую эканамічную эфектыўнасць: па выніках шасці форумаў было падпісана 302 пагадненні аб супрацоўніцтве, заключана камерцыйных кантрактаў на суму каля 2 млрд долараў ЗША.

VII Форум рэгіёнаў запланаваны на восень і пройдзе на тэрыторыі Мінска і Мінскай вобласці. Мяркуецца, што яго ўдзельнікі засяродзяцца на абмеркаванні вынікаў святкавання ў свеце 75-годдзя заканчэння самай страшнай за ўсю гісторыю чалавецтва вайны. Таму ўзгодненая з Саветам Федэрацыі Расіі тэма форуму гучыць так: «Гістарычная спадчына Вялікай Перамогі як аснова развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў Беларусі і Расіі».

У размове з журналістамі Наталля Качанава падкрэсліла: Савет Рэспублікі разлічвае, што форум пройдзе на высокім арганізацыйным узроўні. Паводле яе слоў, гэта будзе вельмі маштабнае мерапрыемства, якое дазволіць рэгіёнам выйсці на новы ўзровень супрацоўніцтва па ўсіх напрамках. А каб яно атрымалася і плённым, і запамінальным, старшыня Савета Рэспублікі ў ходзе пасяджэння аргкамітэта заклікала яго ўдзельнікаў зрабіць трохдзённую праграму маючага адбыцца форуму насычанай і цікавай. Яго работа разгорнецца ў пяці секцыях. Напрыклад, у адной з іх будзе абмеркавана тэма: «Подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — аснова выхавання патрыятызму і грамадзянскай адказнасці». Сугучная парадку дня форуму і тэма іншай секцыі: «Беларусь і Расія: пашырэнне сумесных намаганняў па супрацьдзеянні гераізацыі нацызму на міжнародных пляцоўках».

Адзначым, што на форуме абмяркуюць супрацоўніцтва не толькі ў кантэксце захавання гістарычнай спадчыны і патрыятычнага выхавання, але і сумесныя эканамічныя праекты. Таксама будуць падпісаны новыя пагадненні аб супрацоўніцтве і камерцыйныя кантракты.

Запланавана пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Беларусі і Савета Федэрацыі Расіі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Намечана таксама сустрэча спікераў верхніх палат беларускага і расійскага парламентаў з кіраўнікамі рэгіёнаў краін.

Таксама ў праграме VII Форуму значыцца наведванне гасцямі гісторыка-культурных аб'ектаў, якія звязаны з апошняй вайной. Напрыклад, музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, «Лініі Сталіна», Хатыні, Кургана Славы і іншых.

Леанід ТУГАРЫН.

ЗА КРУГЛЫМ СТАЛОМ

ПРА ФІНАНСЫ І НЮАНСЫ

Канкурэнцыя, інтэрнэт-паслугі і абарона правоў спажыўцоў

На гэтыя тры галоўныя моманты звярнулі ўвагу дэпутаты і чыноўнікі падчас круглага стала Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, абмяркоўваючы праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб плацежных сістэмах і плацежных паслугах».

Адкрываючы круглы стол, **старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** адзначыла, што ў паўсядзённым жыцці мы пастаянна сутыкаемся з плацяжамі з мабільнага тэлефона і купляем тавары ў інтэрнэце, выбіраючы іх на розных сайтах. Дык вось, плацежныя паслугі, якія ў гэтым выпадку мы атрымліваем як спажыўцы, аказваюць нам арганізацыі, якія не з'яўляюцца банкамі і не адносяцца да банкаўскіх крэдытна-фінансавых структур. Іх дзейнасць у гэтым кірунку ў дзеючым заканадаўстве належным чынам не ўрэгулявана. Сенатар заўважыла, што адсутнасць такіх нормаў для патэнцыйных пастаўшчыкоў плацежных паслуг, з аднаго боку, негатыўна адбіваецца на забеспячэнні ўстойлівасці плацежнай сістэмы ў цэлым, а з другога боку — на развіцці і пашырэнні гэтых паслуг на тэрыторыі нашай краіны, што стрымлівае якасць і ініцыятыўнасць у адпаведнай галіне. Неабходны рэгламентаваныя правілы гульні для ўсіх гульцоў рынку і развіццё добрасумленнай канкурэнцыі ў сферы плацежных паслуг, лічыць спікер.

Для таго каб заканадаўства ішло ў нагу з часам і паспяхова развіваўся рынак плацежных паслуг, Нацыянальным банкам разам з зацікаўленымі бакамі быў распрацаваны праект адпаведнага закона. «Нам трэба вызначыць канцэптуальныя падыходы па гэтым праекце, абмеркаваць розныя нюансы, каб сенатары былі ў курсе. Каб у той час, калі мы яго атрымаем на ўзгадненне, усе разумелі, пра што ідзе гаворка і што можна яшчэ выправіць», — удакладніла сваю пазіцыю Таццяна Рунец.

Намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ акцэнтаваў увагу на тым, што свет змяняецца вельмі хутка, а новыя тэхналогіі ўкараняюцца з лавінападобнай хуткасцю. У значнай ступені гэтыя змены адбываюцца і ў плацежным рынку, з'яўляюцца новыя спосабы і магчымасці правядзення плацяжоў. «Што было пяць гадоў таму і цяпер — гэта абсалютна розныя рэчы. Таму фінансавыя рэгулятары імкнуцца прытрымлівацца ўсіх новых тэндэнцый і мяняць заканадаўства досыць жыва, каб яно было максімальна гнуткае, дазваляла ўкараняцца новым тэхналогіям.

Прадстаўнік Нацбанка лічыць: чым зручней пабудаваны бізнес-працэсы з плацяжамі, тым гэта лепш у цэлым для сацыяльна-эканамічнага развіцця любой краіны. Новы законапраект больш выразна акрэсліць усе правілы рынку плацежных паслуг, дазволіць дапусціць на рынак структуры малога і сярэдняга бізнесу, а гэта ўзмоцніць канкурэнцыю. Прапанаваныя змены будуць спрыяць павелічэнню долі безнаяўных плацяжоў, што з'яўляецца несумненным плюсам для эканомікі нашай краіны. Акрамя таго, прынясце праекта мінімізуе рызыкі, звязаныя з праходжаннем грошай па разнастайных каналах, таму што будуць вырашаны пытанні з кібербяспекай усёй сістэмы.

«Цэнавая стабільнасць павінна быць забяспечана за кошт развіцця канкурэнцыі і дэманапалізацыі рынкаў — менавіта гэтая задача вырашаецца такімі заканадаўчымі актамі, як названы праект. А цэнавая стабільнасць уваходзіць у кампетэнцыю нашага міністэрства», — адзначыў **міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ.** Ён падкрэсліў, што дакумент пашырае многія вузкія месцы развіцця рынку канкурэнцыі. Працаўнікаў у канкурэнцыі заўсёды больш, чым прыхільнікаў, таму што гэта заўсёды балюча. Пры наяўнасці канкурэнцыі слабыя прадпрыемствы зачыняюцца або страчваюць рабочыя месцы. Новы закон будзе спрыяць развіццю канкурэнцыі і рабіць яе больш жорсткай.

Ці гатовы гандаль да такіх умоў? «Магу адзначыць, што доля Белкаапсаюза за апошні час знізілася ў разы. Гэтая арганізацыя ўжо не з'яўляецца вядучым гульцом. Хоць яны сапраўды выконваюць сацыяльную функцыю, не закрываючы крамы ў тых вёсках, дзе колькасць насельніцтва не забяспечвае неабходную норму прыбытку. Але на іх месца прыходзяць іншыя структуры, больш гнуткія па плацежнай сістэме. І робяць гэта без падтрымкі дзяржавы».

Другая частка прапанаванага праекта заключаецца ў развіцці інтэрнэту, паслуг, звязаных з ім, інтэрнэт-гандлю. «Інтэрнэт-гандаль — гэта выдатна. Хутка, танна, зручна. Але гэта таксама канкурэнцыя, бо тыя, хто займаецца вытворчасцю, задаюць сёння шмат вострых пытанняў. Чаму кошты тавараў з Узбекістана на такім нізкім узроўні? Мы спрабуем з гэтым змагацца, але гэта непапулярная мера сярод людзей. Таму што чалавеку цікава пайсці і купіць тавар па невысокай цане. Інтэрнэт-гандаль выводзіць нас у зусім іншы свет, дзе межаў паміж краінамі не існуе. І таму айчыннаму вытворцу давядзецца канкурыраваць з глабальным светам», — адзначыў Уладзімір Калтовіч.

Старшыня праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк», намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Віктар АНАНІЧ падкрэсліў, што плацежныя паслугі — абавязковы атрыбут любой фінансавай установы. Функцыянаванне гэтага рынку патрабуе пэўных правілаў, выкананне якіх павінна гарантаваць захаванне правоў і законных інтарэсаў карыстальнікаў плацежных паслуг. Зборам такіх правілаў і закліканы стаць вынесены на грамадскае абмеркаванне праект Закона аб плацежных сістэмах і плацежных паслугах.

«Як найбуйнейшы фінансава-крэдытны інстытут краіны, мы акумулюем на сваіх рахунках 39 % дэпазітаў суб'ектаў гаспадарання і амаль 44 % укладаў фізічных асоб. Аб'ём крэдытнага партфеля Беларусбанка займае 43 % у сукупным аб'ёме крэдытаў юрыдычных асоб банкаўскай сістэмы і 57 % партфеля фізічных асоб», — заўважыў Віктар Ананіч.

«Як актыўны ўдзельнік рынку плацежных паслуг, мы ўважліва і глыбока прапрацавалі праект Закона, абмяркоўвалі з распрацоўшчыкам асноўныя нормы і пастулаты, уносілі дапаўненні. Упэўнены, што прыняцце закона павысіць канкурэнтаздольнасць нацыянальнага плацежнага рынку, а гэта — пашырэнне спектру ўдзельнікаў рынку, павышэнне якасці паслуг, у рэшце рэшт — павышэнне ўзроўню даступнасці кліентам плацежных паслуг. Безумоўна, праект гэтага дакумента павінен абмяркоўвацца на самых розных узроўнях і, вядома, на ўзроўні Савета Рэспублікі», — заявіў Віктар Ананіч.

Сяргей КУРКАЧ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗЯЛЁНЫЯ КАЛІДОРЫ Ў ЗОНАХ УРБАНІЗАЦЫІ

Паміж эканомікай і прыродай

Праз 10 гадоў 80 % беларусаў будуць жыць у гарадах. Цяпер гэтая лічба складае каля 70 %. А адна з найбольш значных тэндэнцый стратэгіі ўстойлівага развіцця — урбанізацыя, расказала **Таццяна КАНАНЧУК, начальнік упраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

— Гарады нясуць усё большую нагрузку, і патрэбна аб'яднаць намаганні, каб максімальна захаваць прыроднае багацце. Тэма зялёнага будаўніцтва становіцца ў свеце ўсё больш значнай. Канферэнцыя ААН па жыллі і ўстойлівым гарадскім развіцці Хабітат-III прыняла новую праграму развіцця гарадоў, якая дапаможа ў рэалізацыі мэт у гэтай галіне на комплекснай аснове.

У дакуменце адзначаецца, што ўрбанізацыя пры належным планаванні і фінансаванні можа стаць дзейснай і карыснай для ўсіх. Важна дасягнуць балансу паміж захаваннем прыроднага асяродку і эканамічным развіццём.

Зялёная эканоміка — эканамічная мадэль, якая стымулюе рост даходаў насельніцтва і рабочых месцаў, не ствараючы пры гэтым рызыку для прыроды.

Гэта значыць нізкае ўжыванне вугляродаў, эфектыўнае выкарыстанне рэсурсаў, сацыяльная інклюзія.

У межах рэалізацыі дзяржаўнай экалагічнай палітыкі Беларусі створаны ўмовы для вытворчасці цепла- і электраэнергіі з выкарыстаннем аднаўляльных крыніц. Будуюцца энергаэфектыўныя зялёныя жылыя кварталы ў Мінску, Магілёве, Гродна. У сталіцы 38,8 % наземнага пасажырскага транспарту электрыфікавана. Развіваецца рух зялёных гарадоў.

Пры такім падыходзе скарачэнне колькасці выкідаў CO_2 спалучаецца з інвестыцыямі ў «зялёныя» прадпрыемствы. Нягледзячы на з'яўленне новых прадпрыемстваў, выкіды змяншаюцца, а найлепшыя лічбы ў гэтым накірунку краіна атрымае ад работы Беларускай АЭС, упэўнена прадстаўніца Мінпрыроды.

Міжнародныя абавязкі ў рэгіянальных межах

Праект «Зялёныя гарады» скіраваны на развіццё планаў зялёнага горадабудаўніцтва, падтрымку ініцыятыў па ўстойлівым гарадскім транспарце, павышэнні энергаэфектыўнасці ў малых і сярэдніх гарадах.

Большасць насельніцтва канцэнтруецца ў сталіцы і абласных цэнтрах. З малых гарадоў людзі з'язджаюць, жыць тут становіцца нецікава, эканоміка слаба развіваецца, таму акцэнт праекта зялёнага горадабудаўніцтва скіраваны менавіта на сярэднія і малых гарадах, патлумачыла **Ірына УСАВА, кіраўнік праекта «Зялёныя гарады»:**

— Назапашаны вопыт паказвае, што правільна распрацаваныя новыя падыходы планавання для гарадскіх тэрыторый спрыяюць росту дабрабыту і якасці жыцця насельніцтва. Рашэнні, якія прымаюцца на мясцовым узроўні па

Фота Ірыны СІДАРОК.

шчыльнасці, землекарыстанні, развіцці эканомікі, уплываюць і на спажыванне энергіі, і на скарачэнне CO_2. Гэта ў сваю чаргу дапамагае выконваць міжнародныя абавязкі краіны ў межах Парыжскага пагаднення і Устойлівага развіцця 2030.

У Беларусі распрацаваны рэкамендацыі для стратэгічных дакументаў на нацыянальным узроўні, такіх як канцэпцыя НСУР 2035, дзе эксперты вызначылі прапановы адносна адаптацыі да змянення клімату, выкарыстанне смарт-тэхналогій і новых механізмаў зялёнага фінансавання.

Планы зялёнага горадабудаўніцтва ўжо распрацаваны для Навагрудка, Полацка і Наваполацка. Для двух апошніх створаны таксама адзіны план устойлівай гарадской мабільнасці.

Летась да праекта далучыліся Зэльва, Карма, Гарадок, Крычаў. А ўсяго ў пагадненні аб клімаце і энергіі ўдзельнічае больш як 40 айчынных мястэчак, якія ўзялі на сябе абавязак паменшыць колькасць парніковых газаў на сваіх тэрыторыях не менш як на 30 %.

Знайсці «зялёны астравок»

Аднак, акрамя стратэгічных дакументаў, у найбліжэйшы час гарадам спатрэбяцца шматлікія інвестыцыі для паляпшэння якасці інфраструктуры. Гэтыя сумы, па папярэдніх разліках, даходзяць да некалькіх мільярдаў, якія штогод неабходна інвеставаць у падтрымку гарадской інфраструктуры, заўважыла кіраўнік праекта:

— Неабходна ствараць механізмы для фінансавання інфраструктуры. Цяпер сумесна з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі мы распрацоўваем падыходы для рэалізацыі энергаэфектыўных праектаў, у прыватнасці, механізмаў энергасэрвіснай дзейнасці. Летась распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні прынцыпаў зялёных закупаў. Гэту работу працягнем і сёлета.

Вырашыць задачу стварэння зялёных гарадоў можна, толькі калі разглядаць іх як частку зялёнага рэгіёна і як тэрыторыю, што складаецца з фрагментаў. Пры фарміраванні зялёных гарадоў нешта захоўваецца ў першасным выглядзе, нешта аднаўляецца, аднак заўжды трэба думаць на перспектыву, раіць **Георгій ПАТАЕЎ, доктар архітэктуры, прафесар кафедры горадабудаўніцтва БНТУ:**

— Зоны ўрбанізацыі сёння сталі настолькі шчыльнымі, што знайсці ў сучасных гарадах зялёны астравок досыць складана. Аднак ёсць і адваротныя трэнды. Напрыклад, дом-васьмёрка ў Капенгагене, райскі сад «Вафіла» ў Іспаніі. Сёння актыўна развіваюцца арт-паркі, дзе сучасныя скульптуры спалучаюцца з ландшафтнымі кампазіцыямі. Парк Юпіцер каля Эдынбурга аўтарства Чарльза Джэймса, дзе новыя формы цудоўна дапаўняюць натуральную прыроду. Міні-паркі — так званыя кішэнныя паркі, якія сёння можна рэальна ўпісваць нават у супершчыльныя мегаполісы. І гэта правільнае мысленне. Мы можам рэальна мець гэтыя зялёныя калідоры, якія напоўняць зоны ўрбанізацыі і дазволяць нам сфарміраваць камфортнае жыццёвае асяроддзе.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

ШТО Ў ПЛАНАХ?

НА 20 ГАДОЎ НАПЕРАД

Скарачэнне выкідаў парніковых газаў і стварэнне камфортнага гарадскога асяроддзя — прыярытэтныя задачы плана зялёнага горадабудаўніцтва, які дазваляе ў межах горада рэалізоўваць дэкларуемыя на нацыянальным узроўні мэты ўстойлівага развіцця. План таксама дае адказы на пытанні: што, чаму, дзе, як і навошта рабіць, каб горад устойліва развіваўся. Планы зялёнага горадабудаўніцтва, распрацаваныя для Навагрудка, Полацка і Наваполацка, уключаны ў праграмы мясцовага развіцця і маюць на мэце спраўдзіцца да 2050 года. Спецыялісты расказалі, якія змены чакаюць гарады.

Жыллёвы і чалавечы патэнцыял

Стратэгія ўстойлівага развіцця ўяўляе сабой спіс прыярытэтаў і праектаў, якія горад хацеў бы рэалізаваць у найбліжэйшыя два-пяць гадоў, і задае вектары развіцця да 2040-га.

— Каб не спыніцца на стадыі афармлення дакументаў, мы хочам паказаць, як яны павінны працаваць, — кажа **Вера СЫСОЕВА, архітэктар, эксперт праекта па зялёным горадабудаўніцтве.** — Распрацоўваюцца цізеры для далучэння інвестараў для рэалізацыі праектаў. Са свайго боку, летась мы распрацавалі для кожнага горада праекты трансфармацыі існуючых раёнаў адпаведна прынцыпам зялёнага горадабудаўніцтва. Паколькі яны прадугледжваюць абмежаванне тэрытарыяльнага павелічэння горада і рацыянальнае выкарыстанне існуючых рэсурсаў, мы хацелі б паказаць патэнцыял, які хаваецца ва ўжо асвоеных гарадскіх тэрыторыях.

У кожным горадзе вызначаны раёны, якія сталі эксперыментальнымі пляцоўкамі зялёнага будаўніцтва, паколькі ім патрабуецца першачарговая трансфармацыя. У Навагрудку гэта цэнтральны раён у межах вуліц Міцкевіча, Валчэцкага, Гродзенскай, у Полацку — раён Грамы, у Наваполацку — сучасны дзявяты мікрараён.

Усе тры праекты служаць павышэнню сацыяльнай каштоўнасці тэрыторыі, забяспечваюць разнастайнасць асяродку, устойлівую мабільнасць, эка- і энергаэфектыўнасць забудовы, інжынерных камунікацый, роўныя ўмовы даступнасці да базавых гарадскіх структур. Пры гэтым праекціроўшчыкі імкнуліся стварыць непарыўную і разнастайную сетку водных і зялёных прастор горада-экалагічнага каркаса, добра спланаваныя і напоўненыя грамадскія прасторы.

«Навагрудак: захаваем будучыню»

Так назвалі праект па трансфармацыі старажытнага Навагрудка, які мае на мэце ўстойлівае развіццё для павышэння якасці жыцця насельніцтва. Планам прадугледжана рэалізацыя мерапрыемстваў у трох галінах. Фарміраванне камфортнага ўнікальнага гарадскога асяроддзя. Пераўтварэнне гарадскіх тэрыторый з улікам выкарыстання гісторыка-культурнага патэнцыялу. Развіццё альтэрнатыўных спосабаў выкарыстання рэсурсаў у сферы цыркулярнай эканомікі і ў функцыянаванні гарадскіх аб'ектаў.

— У прасторы Навагрудка для дасягнення сфармуляваных прыярытэтаў робіцца акцэнт на дыферэнцыраваным развіцці эканамічна актыўных тэрыторый горада і падтрымцы камфортнасці раёнаў. На фарміраванні экалагічнага каркаса горада і ўкараненні навацый для рэсурсазберажэння і павышэння энергаэфектыўнасці, — расказала архітэктар.

Фота Ірыны СІДАРОК.

У цэнтральным раёне горада, які займае 40 гектараў плошчы, змешана розная тыпалогія забудовы: ад школ і садкоў да шматкватэрных дамоў і прыватнага сектара. Чвэрць гэтай тэрыторыі не выкарыстоўваецца. З улікам асваення існуючага патэнцыялу тут можна дадаткова размясціць тысячу чалавек. Фактычна столькі ж жыхароў у Навагрудку стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. На гэтай плошчы ёсць рэзерв для будаўніцтва 46 тысяч квадратных метраў жылля і 9 тысяч квадратных метраў грамадскай забудовы. Пры гэтым шчыльнасць павялічыцца нязначна і застанецца ў межах 200 чалавек на гектар, што аптымальна для гарадской забудовы ў цэнтры. Такім чынам, у цэнтральным раёне (рабочая назва праекта па трансфармацыі якога — «Дыяганаль росту») змесціцца чвэрць гараджан. Яны будуць пражываць у розных тыпах жылля, у тым ліку ў камфортных урбан-вілах (аднапад'ездных дамах сярэдняй павярховасці) і таўнхаусах (блакіраваных дамах), удакладніла Вера Сысоева.

— У плане гэта «трохкутнік», яго праразае дыяганаль, што забяспечвае транзіт ад цэнтра (гістарычнага ядра) да новых раёнаў. Такім чынам забяспечваецца зручная сувязь (мабільнасць). Навагрудак — горад кароткіх адлегласцяў, тут рэальна хадзіць пешшу і ездзіць на роварах. Да гэтай дыяганалі далучаюцца аб'екты ўзроўню раёна. Але яны таксама дазволяць прыцягнуць сюды турыстаў, насыціць патрэбы моладзі і састарэлых праз студэнцкі сквер, пляцоўку перад гандлёвым цэнтрам, канцэрты каля вадаёма. Тут прадумана функцыянаванне кожнага вольнага квадратнага метра грамадскай тэрыторыі.

У Навагрудку плануюць стварыць комплексную сістэму для падліку спажывання чатырох відаў рэсурсаў: цяпло, вада, газ, электрычнасць. Гэта будзе першая інтэграваная сістэма ў Беларусі на прыкладзе двух жылых дамоў. Ужо завяршаецца распрацоўка дакументацыі і аб'яўляецца тэндар на закупку абсталявання. Па вясне пачнецца будаўніцтва і наладка сістэмы. Пасля ўкаранення гэтых лічыльнікаў эксперты чакаюць 5—10 % эканоміі энергарэсурсаў у год. На рэалізацыю запланаваных мерапрыемстваў спатрэбіцца два гадавыя бюджэты горада.

Ірына СІДАРОК.

На адной хвалі

«ПІН_КОД» — для тых, хто ў тэме!

Студыя маладзёжнага інтэрактыўнага праекта «ПІН_КОД» у прамым сэнсе стала адкрытай: кожную пятніцу вядучыя саступаюць месца сваім гледачам. А школьнікі, застаўшыся ў здымачным павільёне без дарослых, абмяркоўваюць актуальныя, важныя і злабадзённыя тэмы.

Ідэя новай рубрыкі з'явілася з падказкі самих гледачоў-падлеткаў, таму што часам іх погляды на многія рэчы кардынальна разыходзяцца з пазіцыяй дарослых. А калі людзі старэйшага пакалення даюць ім парады ў эфіры, то гэта выклікае хутчэй скептыцызм, чым жаданне верыць і прыслухоўвацца. Школьнікі стаміліся ад павучанняў і хочуць адкрыта абмяркоўваць «свае тэмы», дзяліцца прыколамі і гаварыць пра тое, што іх больш за ўсё раздражняе.

Фота здадзена Белтэлерадыёкампаніяй.

Па пятніцах студыя «ПІН_КОДа» будзе знаходзіцца ў іх распараджэнні. Выказаць сваю пазіцыю ў тэлеэфіры змогуць тыя, хто праявіць ініцыятыву і падасць заяўку на ўдзел у праграме. Зрабіць гэта можна, напісаўшы паведамленне ў суполцы «УКантакце» (vk.com/pincode_b2) і прайшоўшы кастынг. Аднак няхай будучых прэтэндэнтаў гэта не палохае: адбор праходзіць у фармаце суразмоўя, дзе дастаткова патлумачыць, чаму тая ці іншая тэма вас хвалюе, і прадэманстраваць тое, наколькі вы можаце будаваць свае думкі, не саромеючыся быць незразумелымі і адстойваючы свае меркаванні.

— Падчас папярэдняй размовы з будучымі ўдзельнікамі мы абмяркоўваем розныя нюансы, каб рэдактары праграмы таксама маглі ўнікнуць у тэму, а потым падрыхтаваць яшчэ нейкі дадатковы матэрыял з відэа, меркаваннямі спецыялістаў. І мы, вядома, разумеем, што, трапляючы ўпершыню ў тэлевізійную студыю, дзеці губляюцца і ім патрэбны час і кола аднадумцаў, каб разняволіцца і размаўляць адкрыта, — зазначае **кіраўнік праекта «ПІН_КОД» Ягор ШОЛЬКІН.** — Па папярэдніх здымках можна сказаць, што ідзем у правільным кірунку: знаёмства і размова з дзецьмі даюць нам больш дакладнае ўяўленне пра тое, чым яны сёння жывуць і пра што размаўляюць у коле сяброў. Гэта і сучасныя накірункі музыкі, і іх уяўленне пра дасягненне поспеху, і спосабы самавыяўляцца праз знешнасць, і многія іншыя тэмы. Мы гатовыя выслухаць ідэі і, калі тэма сапраўды актуальная, нават арганізуем выязную студыю для здымак у любым населеным пункце Беларусі.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 107

З 24 студзеня да 2 лютага ў РЦАП па шахматах і шашках прайшлі чэмпіянаты Беларусі па шашках-64. У мужчынскім чэмпіянаце прынялі ўдзел 14 шашыстаў, сярод якіх пяць міжнародных гросмайстраў. Перамог дзесяты чэмпіён свету і Еўропы Ігар Міхальчанка (Ваўкавыск) — 19 ачкоў з 26 магчымых. На другім месцы экс-чэмпіён свету Андрэй Валюк. Трэцім фінішаваў гросмайстар Міхаіл Семянюк, гэта яго першая ўзнагарода ў чэмпіянатах Беларусі. Абодва мінскія гросмайстры набралі па 17 ачкоў. У жанчын на старт выйшлі 12 шашыстак у тым ліку тры міжнародныя гросмайстры. Высокі клас прадэманстравала чэмпіёнка свету Яна Якубовіч. Яна і перамагла ў чэмпіянаце з вынікам 18 ачкоў з 22 магчымых. На другім месцы майстар з Гродна Эма Макарэвіч, якая адстала ад пераможцы на адно ачко. Трэцяй фінішавала 14-гадовая майстар Вікторыя Мікалаева — 14 ачкоў. Толькі 4-ы і 6-ы вынікі паказалі гросмайстры Вера Хвашчынская і Дар'я Федаровіч.

Паглядзіце прыклады гульні ўдзельнікаў.

Петрусёва П. — Нікалаева В. Партыя праходзіла ў апошнім туры і вырашыла лёс бронзавага медаля.

1. e3-d4 h6-g5 2. g3-h4 d6-e5 3. f2-e3 b6-a5 4. g1-f2 g7-h6 5. d4-c5 c7-b6 6. e3-d4 g5-f4 7. a3-b4 h6-g5 8. f2-g3 f8-g7 9. d2-e3 f4xd2 10. c1xe3 Прапануем скончыць партыю нашым чытачам і вызначыць вынік.

№ 17



№ 17 Петрусёва П. — Нікалаева В.

Белыя простыя шашкі: a1, e1, b2, h2, c3, e3, g3, b4, d4, h4, c5 (11).

Чорныя простыя шашкі: a5, e5, g5, b6, f6, a7, e7, g7, b8, d8, h8 (11).

№ 18 Макарэвіч Э. — Нікіфарава Д.

Белыя простыя шашкі: g1, b2, c3, d4, h4 (5).

Чорныя простыя шашкі: f4, d6, h6, a7, c7 (5).

Белыя рэалізавалі сваю перавагу 1. b2-a3 a7-b6 2. h4-g5 f4-g3 3. c3-b4 h6:f4 4. b4-c5 d6:b4 5. a3:a7 g3-h2 6. d4-e5 f4:d6 7. a7-b8 +.

№19 Куніца А. — Дарашэнка С.

Белыя простыя шашкі: c1, e1, g1, b2, e3, g3, b4, a5 (8).

Чорныя простыя шашкі: a3, c5, e5, g5, d6, c7, g7, d8 (8).

Белыя правялі камбінацыю, пакажыце яе. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні.

Выпуск № 106 ад 31.01.20.

№ 12 g5, f2, c5 (b4) g7 (f6, e7) b4 (d6, d6) c5, b2x.

№ 13 de5, b4, e5 (d:f4A) g7, g3, e3, g7 (f6, d6, d6) c5, b2x. A (h:f4) g7, de3, g7 (f6, f4)c5 (a7) b2 (cb6) d6x.+.

№ 14 1. g1-f2 e5:g7 2. a5-b6 c7:c3 3. f2-g3 h2:f4 4. g5:e7 f8:d6 5. h6:c1+.

№ 15 1. d4-e5 c3:a1 2. g5-f6 e7:e3 3. g7-h8 a1:f6 4. h8:g1+.

№ 16 1. c5-d6 e7:a3 2. c3-b4 a3:c5 3. b6:d4 f2:c5 4. a7:h8+.

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

ЧАТЫРЫ ВЯСЕЛЛІ І «DANCE РЭВАЛЮЦЫЯ»

Менавіта ў такім ключы беларускія тэлеканалы запрашаюць сваіх гледачоў бавіць час на выхадных. На тэлеканале «Беларусь 2» 15 лютага — прэм'ера шоу «Чатыры вяселлі», а на АНТ працягваем сачыць за «Dance рэвалюцыяй».

«Чатыры вяселлі» — гэта рэаліці-шоу пра незвычайнае святкаванне вяселляў, якія арганізоўваюць самыя звычайныя людзі. У кожным выпуску праекта гледачы даведваюцца пра самыя смелыя планы нявест і пра тое, наколькі іх атрымліваецца ўвасобіць у жыццё, бачачы неверагодныя строі, яркія ідэі, а часам — і правалы ў арганізацыі свята.

Падчас работы неабходна ўводзіць на гэтую плошчу новых карыстальнікаў. Такім чынам адбудзецца сацыяльны мікс, «разбавіцца» аднатоннасць насельніцтва, што дазволіць стварыць больш здаровую сацыяльную атмасферу ў пэўным месцы. Нават калі пры гэтым спатрэбіцца нейкае новае кропкавае будаўніцтва на тэрыторыі, усё роўна менш шанцаў, што гэтае месца ператворыцца ў нейкую закрытую сістэму, куды няма доступу іншым групам.

> Гадоў праз 50 у прыярытэты каштоўнасцяў увойдзе якасць асяроддзя, і пры ацэнцы кошту квадратнага метра менавіта гэта будзе вызначаць цану.

— Прыклады такой закрытасці — рабочыя пасёлкі, дзе жыве адна сацыяльная праслойка, а таксама элітныя «гета» — цэлыя раёны, куды нават зайсці псіхалагічна і фізічна не ўсім камфортна. Такім чынам мы павялічваем пранікальнасць горада і робім яго больш эфектыўным, калі ўбудоўваем аб'екты ва ўжо існуючыя сацыяльныя структуры.

Жыллёвая кар'ера? Гэта магчыма!

Існаванне такога паняцця, як «жыллёвая кар'ера», дазваляе людзям камфортна праводзіць жыццё ў адным раёне, не надта мяняючы лакацыю свайго пражывання, аднак пры гэтым мяняць яго ўмовы ў залежнасці ад патрэб. Напрыклад, маладому спецыялісту без сям'і хопіць «аднушкі» з маленькай кухняй. Са з'яўленнем сям'і яму патрэбна большая плошча, а калі дзеці вырастуць і раз'едуцца — падыдзе іншы тып кватэры. Жыллёвая кар'ера дазваляе задавальняць усе гэтыя патрэбы ў сваёй любімай лакацыі, не губляючы пачуцця прывязанасці да месца.

— Менавіта ўбудоўванне новых тэхналагічных структур і трансфармацыя існуючых тэрыторый можа даць магчымасць для жыллёвай кар'еры розным людзям па ўсім горадзе. Гэта таксама дапаможа бязбольна прывучыць да карыстання якаснымі гарадскімі прасторамі людзей, у якіх адсутнічае такі вопыт, — мяркуе Ілона Эльяшэвіч. — Ва ўжо забудаванай прасторы значна больш цікавых пунктаў для праектавання і трансфармацыі, што дазваляе атрымліваць больш варты вынік. Такім чынам можна разнастаіць кампазіцыю горада і пры гэтым не страціць існуючае. Увод рашэнняў праекціроўшчыкаў пры гэтым паэтапны, і на кожнай стадыі можна ацаніць, ці правільнае рашэнне было прынятае, своечасова змяніць яго, калі неабходна. Пры гэтым захоўваюцца патэнцыяльна значныя аб'екты, якія пакуль не маюць гістарычнай каштоўнасці і не ахоўваюцца дзяржавай. А вось калі забудоўваюцца пустыя прасторы, ацаніць правільнасць рашэння можна толькі пасля поўнай рэалізацыі.

Архітэктары абмяркоўваюць сучаснасць і будучыню гарадоў.

Недавыкарыстаныя тэрыторыі сябе пакажуць

Адшукваць у горадзе недавыкарыстаныя тэрыторыі і зносіць шматпавярховую забудову. У такім кірунку прыйдзецца працаваць праекціроўшчыкам у будучыні, каб знаходзіць новыя плошчы пад будаўніцтва, павышаючы эфектыўнасць горада, упэўнена **Лізавета ЧЭПІКАВА, архітэктар, урбаніст Мінскай урбаністычнай платформы «Праектінжбуд».**

Яна прааналізавала, як можна змяніць паўночна-ўсходнюю частку сталіцы, якая, па словах архітэктара, мае найбольшую колькасць наслаенняў па перыядах забудовы:

— Гэтая частка Мінска забудавана практычна поўнасцю, яна не надта шчыльная і мае вялікі камерцыйны патэнцыял, бо знаходзіцца ў першых трох эканамічных зонах. Я ўзяла інфармацыю перапісу насельніцтва 2012 года і склала свае схемы шчыльнасці па розных паказчыках. Паклала гэтыя звесткі на карту, і ўбачыла, што гарадскі асяродак тут разрознены. Шмат месцаў, якія не звязаны паміж сабой: прамысловых тэрыторый, паркаў, пустыроў.

Разглядаючы шчыльнасць размеркавання кватэр і жыхароў па раёне, спецыяліст падзяліла горад на часткі, якія забудоўваліся ў пэўны перыяд і стваралі пэўныя структуры.

— Перш чым перарабляць прастору, трэба разумець патэнцыял і праблемы жылой тэрыторыі, — разважае яна. — Прадстаўляць, як якасна ўшчыльніцца, і прадумваць, як перавыкарыстоўваць гэтую плошчу ў будучым. Колькасныя паказчыкі можна пераўтвараць у якасныя на лакальным узроўні. Я ўзяла тэрыторыю вуліц Валгаградская-Кедышка, дзе пераўральна нізкая забудова. Планіроўкі тут у большасці аднолькавыя, таму ўзровень разнастайнасці нізкі, а якасць жылля невысокая.

Спецыяліст прапануе этапна перавыкарыстоўваць гэтыя тэрыторыі. Яна падзяліла іх на тры часткі, каб з дапамогай прасторавых метадаў перабудоўваць участкі, павышаючы іх эфектыўнасць у колькасным сэнсе. І выбрала падыход прасторавай рэарганізацыі, калі асяроддзе дзеліцца на публічную (агульную) зону, напаўпублічную (дворы) і прыватную.

— Я прапаноўвала сфармаваць нейкую цэнтральную зону, не руйнуючы цалкам забудову і пакідаючы дваровыя тэрыторыі, каб даць грамадству час прызвычаіцца да новай сістэмы. Нам у сваю чаргу можна паглядзець, што атрымалася, а што не, якія былі памылкі пры першым умяшальніцтве.

Важна захаваць існуючую структуру забудовы. Не адгарадзіцца платамі, а пакінуць прастору даступнай, але пазбегнуць транзітнасці і даць жыхарам адчуванне прыватнасці. Праектам прадумана схема азелянення і транспарту, прадугледжана змяненне структуры функцыянальнай забудовы. Жылыя дамы насычаюцца дадатковымі актыўнасцямі, каб сфарміраваць мультыфункцыянальнасць забудоўлі з магчымасцю перавыкарыстання. Пасля ўсіх маніпуляцый удвая павінен павялічыцца жылы фонд і шчыльнасць насельніцтва. Спецыялісты лічаць, што ў будучым можна працаваць з недавыкарыстанымі тэрыторыямі падобным спосабам.

> Можна разнастаіць кампазіцыю горада і пры гэтым не страціць існуючае. Увод рашэнняў праекціроўшчыкаў пры гэтым паэтапны, і на кожнай стадыі можна ацаніць, ці правільнае рашэнне было прынятае, своечасова змяніць яго.

У сталіцы цяпер каля 130 кварталаў капітальнай забудовы, дзе жывуць мінчане, і каля 200 мікрараёнаў.

— Постсавецкія гарады будаваліся з закладзеным у праекты вялікім запасам. Шырокія вуліцы, вялікія водступы. Калі горад расце ўшырыню, захопліваючы новыя тэрыторыі, мы тым самым закладаем у яго бомбу замаруджанага дзеяння, — перакананы **Міхаіл СЦЯПУРА, кіраўнік праектаў MLA+.** — Гэта абцяжаранне для функцыянавання горада на перспектыву. Спатрэбіцца яшчэ больш эканамічных рэсурсаў для падтрымкі інфраструктуры: дарог, інжынерных камунікацый. З гэтым сутыкнуліся многія амерыканскія гарады, дзе не хапае падаткаў на падтрымку інфраструктур вуліц. Патэнцыял цяпер у іх такі: або ўшчыльняць горад, або пагаршаць якасць прадастаўляемых паслуг.

Гадоў праз 50, калі самым каштоўным рэсурсам стануць чыстае паветра і вада, у прыярытэты каштоўнасцяў увойдзе якасць асяроддзя, і пры ацэнцы кошту квадратнага метра менавіта гэта будзе вызначаць цану. Патрабаванні да забудовы будуць зусім іншымі, прагназуе **Вера СЫСОЕВА, архітэктар, эксперт праекта па зялёным горадабудаўніцтве:**

— Гэты працэс пачаўся ўжо. У Еўропе, каб прадаць дом, трэба афарміць на яго пашпарт па энергаэфектыўнасці. Калі яна невысокая, ты будзеш плаціць розныя падаткі на нерухомасць. У сучасным свеце энергаэфектыўныя з'яўляюцца ўжо не толькі асобныя будынкі, а нават кварталы. Думаю, з часам з'явіцца новая эканоміка, якая будзе стымуляваць зусім іншыя формы рассялення.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Открытое акционерное общество « Стройдетали»
Месторасположение: Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, д. 134, извещает о проведении 27 марта 2020 года очередного собрания акционеров общества по адресу: г. Вилейка, ул. Стахановская, 134 (помещение столовой)

Повестка дня

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2019 год и основные направления развития в 2020 году.
2. Утверждение акта аудиторской проверки деятельности общества за 2019 год.
3. Утверждение акта ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2019 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерской отчетности за 2019 год.
5. Утверждение использования чистой прибыли за 2019 год.
6. Утверждение размера дивидендов за 2019 год и сроков выплаты дивидендов.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Начало собрания в 16.00.
Время регистрации 15.00–15.50.
Для регистрации акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и доверенность. С информацией о деятельности общества можно ознакомиться в отделе экономики начиная с 1 марта 2020 г.
Наблюдательным советом ОАО «Стройдетали» (протокол № 18 от 11.02.2020 года) принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 17.03.2020 года.
Справки по тел.: (8-01771) 2-25-01, 2-25-10.

УНП 600246748

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

ОАО «Автопромторгагросервис» проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества:
лот № 1: станок токарно-винторезный 1К62Д, инв. № 1528, заводской № 2837.
Начальная цена с НДС (20 %) – 2492 бел. руб. (снижена на 60 %). Задаток 1 % от начальной цены – 24,92 бел. руб.
Лот № 2: станок круглошлифовальный 3В423, инв. № 1591, заводской № 3518.
Начальная цена с НДС (20 %) – 3528 бел. руб. (снижена на 70 %). Задаток 1 % от начальной цены (35,28 руб.).
Станки находятся в г. Марьина Горка, Шацкое шоссе, УП «Пуховичский автотехсервис». Тел.: (801713) 3-57-84, (8-025) 522-84-89.
Задатки перечисляются на р/с № BY94BPSB30121047090189330000 в Региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ул. Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНН 600050952, ОКПО 28879442.
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, доступных по запросу на aptas@inbox.ru либо по адресу: г. Минск, ул. Будславская, 19, каб. 303, 305. Аукцион состоится **03.03.2020 г.** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Будславская, 19. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.02.2020 г.** до **15.00** по указанному адресу.**Тел.: (8017) 289-85-55, (8-033) 697-72-49.**
Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 11.01.2020 г.

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» проводит 28.02.2020 года в 10.00 повторный открытый аукцион по продаже объектов основных средств

Лот № 1			
Сведения о предмете аукциона	**Начальная цена продажи со снижением на 50 %, бел. руб., без НДС**	**Место нахождения имущества**	**Сумма задатка, бел. руб.**
19 зданий и сооружений производственной базы*	1019004,03	Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А	101 900,00
Лот № 3			
Сведения о предмете аукциона	**Начальная цена продажи со снижением на 90 %, бел. руб., без НДС**	**Местонахождение имущества**	**Сумма задатка, бел. руб.**
15 зданий, 10 сооружений, 1 единица оборудования и зеленые насаждения битумной базы*	23 138,10	Могилевская обл., Бобруйский р-н, южнее д. Ковали (в районе ст. Телуша)	2313,00

* список основных средств находится на сайте ОАО «ДСТ № 3» www.dst3.by

В 15.00 повторный открытый аукцион по продаже объектов основных средств:

	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена продажи бел. руб., без НДС	Местонахождение имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Бульдозер «ДЗ-110», тип ТС – бульдозер гусеничный, 1988 г. в.	6300,00	Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156	630,00
Лот № 4	Прицеп «2 ПТС-4.5», тип ТС – прицеп тракторный, 1998 г. в.	1500,00		150,00
Лот № 5	Здание мобильное «М-К1-3», тип ТС – прицеп, 2000 г. в.	1700,00		170,00

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: 28.02.2020 в 10.00 и 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB 3012 1192 4101 1933 0000, код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 25.02.2020 г.; время: 17.00.
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3» www.dst3.by.

ЦЫРКУЛЯРНАЯ ЭКАНОМІКА

Атрымаць электрычнасць... з адходаў

У Камянецкім раёне адкрылася біягазавая станцыя, якая выпрацоўвае энергію менавіта такім чынам

Пачнем з таго, што свінакомплекс ААТ «Белавежскі» з'яўляецца адным з самых буйных у краіне. Такое прадпрыемства выпрацоўвае не толькі карысную прадукцыю харчавання, але і штодня выкідвае тоны вадкай гноевай жыжкі з едкім пахам. І гэта заўсёды было праблемай. Хоць жылы пасёлак размешчаны прыкладна ў трох кіламетрах ад комплексу, часам непрыемны пах дасягае населенага пункта, асабліва калі вецер дзьме ў той бок.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Цяпер будзе інакш, абяцала фірма-інвестар яшчэ на пачатку абмеркавання праекта. Дакументы былі ўзгоднены, дамовы падпісаны, і ў пачатку чэрвеня мінулага года пачалося будаўніцтва электрастанцыі побач са свінакомплексам. За паўгода ўзвялі ўсе асноўныя аб'екты, а ў студзені ажыццявілі пуска-наладачныя работы. Гэты комплекс па сутнасці складаецца з вялікіх рэзервуараў для гною, у ім працуюць тры біярэактары, газагенератар. У апошнім адбываецца анаэробнае (у бескіслародным асяродку) бражэнне арганікі пры пэўнай тэмпературы. У гэтых трох велізарных рэзервуарах з падагрэтай пры перамешванні масы выдзяляецца газ — метан. Газ паступае ў рухавік унутранага згарання, дзе і выпрацоўваецца электраэнергія, словамі, такі вось механізм. А калі патлумачыць прасцей, то электрычнасць атрымліваецца з гною, які пачалі дастаўляць сюды і са свінакомплексу, і з ферм буйной рагатай жывёлы.

Праектная магутнасць новай электрастанцыі складае 1 МВт. Прыкладны тэрмін акупнасці праекта — сем гадоў. А ўзвядзенне станцыі абышлося інвестару ў шэсць мільёнаў долараў. Рэалізавала праект літоўская кампанія Green Genius пры падтрымцы Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця і лакальным супрацоўніцтве з беларускімі банкамі. Гэта кампанія мае вялікі вопыт работы на рынку вытворчасці аднаўляемай энергіі. Цяпер у Беларусі яна эксплуатуе сем біягазавых электрастанцый рознай магутнасці. На Белавежскай станцыі штогод будзе выпрацоўвацца каля васьмі мільёнаў КВт чыстай электраэнергіі.

Падчас адкрыцця новага аб'екта кіраўнік біягазавага кірунку кампаніі GreenGenius Паўлюс Бабраускас адзначыў, што новая біягазавая электрастанцыя будзе не толькі генерыраваць «зялёную» энергію, але і нейтралізуе непрыемны пах ад свінафермы, а таксама ператворыць арганічныя адходы ў вадкае ўгнаенне без паху:

Такім чынам, гэтая і іншыя біягазавыя электрастанцыі спрыяюць рэалізацыі прынцыпаў цыркулярнай эканомікі і станоўча ўплываюць на навакольнае асяроддзе, тым самым паляпшаючы якасць жыцця людзей.

Генеральны дырэктар ААТ «Белавежскі» Аляксандр ДУНЬКОВІЧ адзначыў несумненныя набыткі новага аб'екта:

— Найперш, гэта абеззаражванне гноевых сцёкаў, перапрацоўка іх у добры біягумус, які будзе вывозіцца на палі, што, у сваю чаргу азначае памяншэнне патрэбы ў мінеральных угнаеннях. Ну і важным фактарам бачыцца выпрацоўка цеплавой энергіі для вытворчасці.

Застаецца дадаць, што працаваць новая электрастанцыя будзе кругласутачна ў аўтаматычным рэжыме. Абслугоўваюць яе інжынер і чатыры аператары.

Старшыня Белавежскага сельскага Савета дэпутатаў Жанна ХІЛЮЦІЧ паведаміла карэспандэнту газеты, што мясцовыя жыхары маюць вялікае спадзяванне на паляпшэнне экалагічнай сітуацыі. Белавежскі — адзін з самых прыгожых сельскіх населеных пунктаў Брэстчыны. Вопыту па яго добраўпарадкаванні і аздабленні прыязджаюць вучыцца суседзі, тут бывае нямала гасцей. І калі ў самім аграгарадку непрыемны пах адчуваецца вельмі рэдка, то навакольныя вёскі, напрыклад, Мінькавічы, часцей церпяць ад «водару» сцёкаў. Цяпер, спадзяюцца мясцовыя жыхары, яны пра гэтую нязручнасць забудуць.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Камянецкі раён.

НОВЫ ФАРМАТ

У ГАРМОНІІ З ПРЫРОДАЙ

Браслаў — добры прыклад таго, як паралельна паляпшаецца экалогія, уносіцца ўклад у ахову клімату ўсёй планеты, а мясцовай уладай прыцягваюцца дадатковыя сродкі для фінансавання актуальных праграм.

Добры грамадскі рэзананс выклікаў праект «Браслаўскі раён — першы кліматычна нейтральны муніцыпалітэт Беларусі». Яго распачалі рэалізоўваць пяць гадоў таму. Калі ў Віцебскім аблвыканкаме абмяркоўвалі супрацоўніцтва з прадстаўніцтвам Еўрапейскага Саюза, менавіта гэты кірунак і быў адзначаны.

Першы віцэ-губернатар Алег Мацкевіч, нагадаў, што Віцебская вобласць — адзіная, якая мяжуе з Еўрапейскім Саюзам і Расіяй. І менавіта таму ўсе праекты, якія фінансуюцца для рэалізацыі ў прыгранiччы, служаць пашырэнню сувязяў, навядзенню кантактаў і наладжванню супрацоўніцтва ў розных сферах. І, бясспрэчна, асабліва каштоўныя вынікі рэалізацыі экалагічных праектаў, бо праблема пагаршэння клімату не мае межаў.

Жыхары Браслаўскага раёна ў рамках рэалізацыі згаданага праекта атрымалі шмат карыснага. У прыватнасці, мадэрнізавалі кацельню і перавялі на мясцовыя віды паліва (між іншым, паўночная вобласць краіны — ужо даўно лідар у гэтым пытанні). Сярод іншых навінак у гарадскім асяроддзі — ліхтары, якія «харчуюцца» святлом промняў сонца. А ў адным з дзіцячых садкоў падаграюць ваду пры дапамозе сонечных калектараў, і гэта дазваляе не толькі захоўваць прыродную гармонію, але і эканоміць штогод мінімум 1000 еўра.

Што да выкідаў у навакольнае асяроддзе, то, калі сёлета іх аб'ём паніжаны на 20 %, дык праз дзесяць гадоў узровень шкоды прыродзе будзе набліжаны да... нуля. І ў рамках «Пакта мэраў» прыгранічны горад Віцебшчыны стане першым муніцыпалітэтам краіны, нейтральным кліматычна. Як сцвярджаюць супрацоўнікі прадстаўніцтва ЕС, у Браславе — гарадку з насельніцтвам каля 10 тысяч чалавек (разам з наваколлем па дасягненнях нават перагналі многія гарады Усходняй і Заходняй Еўропы, дзе таксама намагаюцца дасягнуць статусу кліматычнай нейтральнасці і максімуму ў пытанні энергаэфектыўнасці.

Непаўторнасць гарадка і раёна ў тым, што тут няма буйных прамысловых прадпрыемстваў, а ад існуючых сельскагаспадарчых страты для прыроды мінімальныя. Таму менавіта ў гэтым рэгіёне было прасцей распачаць рэалізацыю амбіцыйнага праекта. У выніку іншага раён стане яшчэ больш прывабным для развіцця турыстычнай галіны, стварэння новых працоўных месцаў рэалізацыі ідэй моладзі.

Аднаўленне традыцыйных рамёстваў, адкрыццё новых турыстычных маршрутаў, у тым ліку і кулінарных, рамесных, абрадавых, і вядома, большае развіццё водных відаў адпачынку — пацвярджэнне таго, што кліматычная нейтральнасць — яшчэ і выгаднае ў фінансавым плане для жыхароў. Многія разумеюць, што на экалогіі па-добраму можна зарабляць, і гэта трэнд пашыраецца ва ўсёй краіне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШТО ХВАЛЮЕ?

НАЛАДЗІЦЬ ДЫЯЛОГ, УНІКНУЦЬ У СІТУАЦЫЮ

Прыём грамадзян на Воранаўшчыне і Ашмяншчыне правёў сенатар Ігар ГЕДЗІЧ

Дапамагчы канкрэтнаму чалавеку — такога прынцыпу ў сваёй дзейнасці стараецца прытрымлівацца член Савета Рэспублікі ад Гродзенскай вобласці Ігар Гедзіч, які ўваходзіць у склад Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

У Воранаве на прыём да парламентарыя завітала сталая жанчына са сваёй праблемай: у Кітаі цяпер знаходзіцца пляменнік, і жанчына хвалюецца за лёс хлопца. Праблема пенсіянеркі вырашылася адразу на прыёме: дзякуючы сучасным сродкам сувязі, з маладым чалавекам звязаліся, і ён запэўніў сваячку, што хваляванні дарэмныя.

— Як паказвае практыка, 60-70 працэнтаў пытанняў можна вырашыць аператыўна, — адзначыў сенатар.

У Ашмянскім раёне на прыём да парламентарыя звярнуліся тры заяўніцы.

— Пытанні, з якімі прыйшлі жанчыны, датычыліся жыллёвай праблемы, пенсійнага і воднага заканадаўстваў, рамонту вуліцы ў цэнтры горада, — адзначыў Ігар Гедзіч. — Сумесна са службамі раённага выканаўчага камітэта, якія ведаюць сутнасць справы, мы дасканала вывучым праблемы і знойдзем варыянты, якія не супярэчаць закону і прымальныя для заяўнікаў.

Шматдзетная маладая маці Алена пражывае з дзецьмі ў сацыяльнай кватэры ў Ашмянах. На трэцяе дзіця яна аформіла сямейны капітал і хацела б скарыстацца гэтымі сродкамі для рэканструкцыі вясковай хаты ў Смаргонскім раёне. Гэта домаўладанне зарэгістравана на малодшага сына, але будынак знаходзіцца ў непрыдатным для пражывання стане. Аднак Алена не можа скарыстацца сямейным капіталам, каб адрамантаваць дом, бо не знаходзіцца на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў. На чаргу паставіць яе таксама нельга, бо жыллё ў яе быццам бы ёсць, хоць і сацыяльнае. Сям'я атрымала яго па прычыне таго, што старэйшая дачка з'яўляецца інвалідам дзяцінства.

Ігар Гедзіч паабяцаў даць адказ жанчыне пасля таго, як будзе прапрацаваны алгарытм рашэння агучанай тэмы. Што да прызнання вясковага дома старым, жанчыне было рэкамендавана звярнуцца ў камісію пры Смаргонскім райвыканкаме.

Жыхарка вёскі Будзёнаўка абураная высокім коштам білета на рыбную лоўлю, якая прадстаўляецца арандатарамі на вадаёмах Ашмянскага раёна. Рыбалкай у іх сям'і захапляюцца тры сыны і муж. Атрымліваецца прыстойная сума, хоць часам сваякі вяртаюцца дадому і зусім без улову. Жанчыне патлумачылі, што сёння мясцовыя органы ўлады маюць права здаваць у арэнду вадаёмы як дзяржаўным структурам, так і прыватным асобам. А арандатар мае права ўсталёўваць свой кошт на лоўлю рыбы.

Разам з тым, рэзюмаваў парламентарый, трэба вывучыць гэтае пытанне падрабязна і знайсці рацыянальны выхад. Магчыма, прадугледзець палёгкі для пэўнай катэгорыі грамадзян або сістэму зніжак у вызначаныя дні.

Жыхарку вуліцы Гальшанскай да дэпутата прывялі дзве праблемы: адна — калектыўная, другая — асабістага характару. Ад усіх жыхароў з 28-га па 40-ы дом сваёй вуліцы яна папрасіла дапамагчы добраўпарадкаваць кавалак вулічнага пакрыцця. У непрывабным стане вуліца знаходзіцца ўжо не адзін год. Жыллёва-камунальная служба раёна ведае гэтую праблему. Перыядычна ямы «зразаюцца». Аднак гэтых дзеянняў хапае не болей, чым на два тыдні, а затым усё паўтараецца.

Што да асабістага пытання, жанчына на працягу года не можа прыватызаваць дачны ўчастак. Спачатку грамадзянку не задавальняла пытанне кошту працэдуры прыватызацыі. Калі яно было ўрэгулявана, паўсталі новыя абставіны, якія перашкаджаюць афармленню неабходных дакументаў. З'явіўся прэцэдэнт з суседзямі з нагоды вызначэння межаў участкаў. Цяпер гэта пытанне знаходзіцца ў актыўнай стадыі вырашэння. Да яго далучыліся праектны інстытут «Гроднагіпразем» і землеўпарадкавальная служба Ашмянскага райвыканкама.

— Правядзенне асабістых прыёмаў грамадзян — гэта адзін з эфектыўных і дзейсных спосабаў даведацца аб праблемах, якія ёсць у рэгіёнах, пачуць іх з першых вуснаў, ад насельніцтва, — лічыць Ігар Гедзіч. — Звароты грамадзян арыентуюць нас на канкрэтныя справы. Парламентарыі ўзнімаюць агучаныя праблемы на ўзроўні профільных міністэрстваў і ведамстваў, улічваюць у сваёй дзейнасці. У заканатворчым партфелі нямала ініцыятыў, накіраваных на рашэнне паўсядзённых праблем людзей.

Кансалідацыя ў грамадстве вельмі важная — ад гэтага залежыць поспех развіцця краіны, падкрэсліў ён. Кожны з нас павінен быць скіраваны на стварэнне, а не на разбурэнне.

Па матэрыялах «Воранаўскай газеты» і «Ашмянскага весніка».

НА ВЫЕЗД!

Чакаецца сур'ёзная размова

Сёння ў Клічаўскім раёне Магілёўскай вобласці адбудзецца выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, якую ўзначальвае Міхаіл РУСЫ.

Ва ўмовах, максімальна набліжаных да рэальнай вытворчасці, мяркуецца правесці грунтоўнае абмеркаванне праекта закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб племянной справе ў жывёлагадоўлі». Да размовы запрошаны прадстаўнікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, ветэрынарнай службы, спецыялісты племянной жывёлагадоўлі і іншыя.

Праграма пасяджэння, якое пройдзе на базе УКСП «Саўгас «Дабраволец», даволі насычаная. Зразумела, чакаецца сур'ёзная дыскусія аб мерах па забеспячэнні ўстойлівай і канкурэнтаздольнай вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі.

Сенатараў праінфармуюць аб выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна, госці наведаюць малочнатаварны комплекс «Дуброва», бульбасховішча гаспадаркі, дзе пазнаёмяцца з практыкай удасканалення тэхналагічных працэсаў вытворчасці і захоўвання «другога хлеба».

Таксама запланавана правядзенне асабістага прыёму грамадзян Клічаўскага раёна.

Леанід ТУГАРЫН.

18 марта 2020 г. **ИЗВЕЩЕНИЕ** **№ 4-А/2020**

о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение	Наличие ограничений	Срок аренды, (лет)	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации, руб.
1	В районе ул. Федюнинского	340100000002006375	0,2546	Для строительства и обслуживания супермаркета продовольственных и промышленных товаров, аптеки; кафе, магазина-кулинарии; предприятий бытового обслуживания, приемного пункта прачечной и химчистки; физкультурно-оздоровительного центра	Ограничений в использовании не имеет	5	16 594,17	850,00	3478,64

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6, № 3–14).
3. **Аукцион состоится 18 марта 2020 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, а также иностранные юридические лица, иностранные граждане, консолидированные участники, которые в указанные в извещении сроки внесли задаток для участия в аукционе на следующий счет: **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк», г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (транзитный счет) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк», г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае «непобеды» на аукционных торгах) – это только для физических лиц.** Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.
Перечень документов, представляемых участником:
4.1 заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; гражданам РБ – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
4.2. представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3. идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4. представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5. при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.
5. По желанию «потенциального покупателя» Организатор аукциона осуществляет показ земельного участка на местности.
6. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности в процессе подготовки и проведения аукциона.
7. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
8. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
9. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 14 февраля по 16 марта 2020 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6, 3–14.**

Контактный телефон +375 232 30 12 46. Информация размещена на сайте: www.geodezcentr.by либо gomeloblzem.by

ЗЯЛЁНЫ ШУМ

На памяць аб тысячагоддзі

За мінулы год у Брэсце з'явіліся дзясяткі новых алей, садоў, сквераў, зялёных зон

Думаю, праз нейкіх дзесяць-пятнаццаць гадоў мы ўсвядомім, што гэта была, можа, найлепшая справа, зробленая да юбілею горада. Маецца на ўвазе азеляненне. Яшчэ напярэдадні юбілейнага мінулага года была аб'яўлена акцыя «1000 дрэў да 1000-годдзя Брэста». Актыўна садзіць дрэвы пачалі з восені 2018-га і працягвалі ўвесь мінулы год.

— Пройдзе час, маладыя дрэўцы падрастуць, узмацнеюць, насыцяць горад кіслародам. Бо за апошнія дзесяцігоддзі інтэнсіўнай забудовы людзі толькі і рабілі, што высякалі дрэвы, каб вызваліць пляцоўку для новых кварталаў ды гандлёвых цэнтраў. А летась сапраўды пастараліся выправіць становішча.

У парку 1000-годдзя прайшлі арганізаваныя пасадкі дрэў пад рознымі назвамі. Напрыклад, пасадзіць «Сямейнае дрэва» прыйшлі цэлымі сем'ямі, былі і шматдзетныя бацькі, і тыя, хто гадуе першынца. Садзілі свае алеі ветэраны і мытнікі, журналісты і дзяржаўныя служачыя. У мікрараёне Усход спартсмены высадзілі «Спартыўную» алею, у цэнтры горада з'явіліся сквер «банкіраў» і алея «адвакатаў». І ўсе гэтыя прыгожыя акцыі ставілі мэтай прыцягнуць увагу грамадскасці, падштурхнуць гараджан да ўдзелу ў агульнай справе. Вядома, асноўную работу па азеляненні робіць КУП ЖКГ, але ж калі праходзіць суботнік ці акцыя, то гэта становіцца падобным на свята, няхай і невялікай групы людзей.

Пасадка дрэў на сямейнай алеі.

Варта сказаць, што даволі часта такія акцыі ўзначальваў **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.** Так было ў адзін з выхадных дзён вясны, калі працоўны дэсант на чале з мэрам садзіў алею на рагу вуліц Валгаградскай і Кастрычніцкай рэвалюцыі. Раней там была проста пустка, якую жыхары бліжэйшых дамоў прызвычаілі да выгулу сабак. А цяпер там падымаюцца маладыя дрэўцы.

— Новы сквер з'явіўся і па вуліцы Міцкевіча, дзе ў канцы года паставілі помнік Пушкіну. Крыху далей, у мікрараёне Паўночны дрэвы пасадзіла адміністрацыя Ленінскага раёна. Акцыю тады падтрымалі кіраўнікі ўстаноў і прадпрыемстваў раёна. За адзін дзень на тэрыторыі былога Паўночнага ваеннага гарадка з'явілася больш за 60 рабін, бяроз і дубоў.

А на Набярэжнай Францыска Скарыны ў першую суботу чэрвеня заклалі сад бесперапыннага цвіцення. Клімат у нас, як вядома, змяніўся ў бок пацяплення, таму спецыялісты палічылі магчымым вырошчваць у Брэсце нават тыя расліны, якія раней выглядалі для нас экзатычнымі.

Усяго за юбілейны год, паводле падлікаў спецыялістаў, у абласным цэнтры пасадзілі каля 22 тысяч дрэў. Падзеяй на гэтым фоне можна назваць таксама ўладкаванне Гарадскога саду. Гаворка ідзе пра старадаўні парк у цэнтры горада, які раней называлі гарадскім садам. Ён быў закінуты і зарос кустоўем, аж пакуль у 2015 годзе сюды не прыйшлі зацікаўленыя гараджане, каб расчысціць тэрыторыю. Узначаліў першыя суботнікі мэр горада. А потым быў зроблены праект і пачалося адраджэнне саду. Яго ўрачыста адкрылі летась у першыя дні верасня. Цяпер у горадзе з'явілася яшчэ адна славутасць і прыемны ціхі куток для адпачынку.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ТУРЫЗМ

Бязмежны патэнцыял Нарачанскага краю

Як павысіць турыстычную прывабнасць Нарачанскага краю? Пра гэта ішла размова на выязным пасяджэнні абласнога Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў вёсцы Камарова Мядзельскага раёна.

На долю санаторна-курортных устаноў у раёне прыпадае больш за 87 працэнтаў ад агульнага экспарту паслуг. Для гасцей адкрыты 97 аб'ектаў аграрнага і эка-лагічнага турызму, 50 пунктаў грамадскага харчавання, 15 турыстычных і адна стаянка для кемпінгу. Пачынае развівацца арганічнае земляробства, выпускаецца экалагічна чыстая прадукцыя. Па меркаванні **старшыні раённага Савета па развіцці прадпрымальніцтва Аляксандра БРАЗОЎСКАГА,** неабходна актыўней прыцягваць інвестыцыі ў турыстычную сферу, забяспечваць гасцей не толькі турыстычнымі паслугамі, але і паслугамі гандлю,

грамадскага харчавання, паляпшаць інфраструктуру, павялічваць экспарт паслуг. І, бясспрэчна, больш увагі ўдзяляць рэкламе, інфармацыйнаму прасоўванню магчымасцяў турыстычнай галіны.

Удзельнікі пасяджэння выказвалі таксама прапановы па стварэнні агульнага брэнду рэгіёна. Да канца года плануецца стварыць абласны інфармацыйна-турыстычны цэнтр, які будзе даваць уяўленне аб турыстычным патэнцыяле Міншчыны, у тым ліку і прамысловым, паведаміў **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Мікалай РАГАШЧУК.**

Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача ў 2025 годзе дасягнуць 100 мільярдаў долараў унутранага валавога прадукту, нагадаў ён. Турыстычны патэнцыял павінен «крочыць» у кантэксце сацыяльна-эканамічнага развіцця, што дазволіць забяспечыць людзей працоўнымі месцамі, достойнымі заробкамі, павысіць іх дабрабыт. Прыклад таму — бізнес-інкубатар «Камарова». У вёску ў мінулым годзе пераехалі чатыры чалавекі з Мінска, збіраюцца на малую радзіму яшчэ некалькі сем'яў. І гэта зразумела: для людзей тут ёсць работа, адкрытыя пякарня, сыраварня, піваварня. Тут збіраюцца зарэгістраваць франшызу — хлеб па камароўскіх рэцэптах маюць намер пячы ў суседніх раёнах Гродзенскай вобласці. У планах — адкрыць школу бізнесу для жанчын. Бізнес-інкубатар мае на мэце падрыхтоўку кадраў для сельскай мясцовасці, а значыць, і развіццё тэрыторый — для таго каб узровень жыцця ў невялікіх населеных пунктах не адрозніваўся ад гарадскога.

Акрамя таго, прагучала прапанова прадаваць нявыкарыстаныя будынкі не па камерцыйных цэнах, а за адну базавую велічыню пры ўмове стварэння ўладальнікам новых рабочых месцаў. Падтрымалі прысутныя і ідэю ўключэння Мядзельскага раёна ў зону спрошчанага візавага рэжыму.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

КОНКУРС ІНІЦЫЯТЫЎ

МЫ САМІ!

У Мінску прайшоў стартавы семінар па рэалізацыі праекта «TANDEM — V». Супрацоўніцтва для ўдзелу грамадзян і развіцця мясцовых супольнасцяў у Рэспубліцы Беларусь».

Падчас яго прэзентаваліся праекты, якія перамаглі ў конкурсе «Грамадзянскія ініцыятывы ў вырашэнні пытанняў мясцовага значэння». Традыцыйна іх фінансуе Еўрапейская Асацыяцыя мясцовай дэмакратыі ALDA з удзелам грамадскага аб'яднання «Фонд імя Льва Сапегі». Сёлета ў краіне будуць рэалізаваны 12 ініцыятыў.

У семінары прымалі ўдзел старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валянцін Семяняка, старшыня праўлення Фонду імя Льва Сапегі Міраслаў Кобаса, каардынатар праектаў Еўрапейскай асацыяцыі мясцовай дэмакратыі (ALDA) Віктар Катрута. Таксама прысутнічалі прадстаўнікі мясцовых органаў улады базавага і пярвічнага ўзроўняў, грамадскіх арганізацый розных рэгіёнаў краіны — аўтары і пераможцы грамадзянскіх ініцыятыў. Менавіта яны прэзентавалі свае лакальныя праекты.

Дырэктар Віцебскага абласнога аддзялення Беларускага дзіцячага фонду Вольга ОБУХАВА расказала аб ініцыятыве «Добры спорт», які будзе рэалізаваны ў аграгарадку Альгова Віцебскага раёна. «У жыхароў ніколі не было нармальнай спартыўнай пляцоўкі. Гэта і паслужыла стымулам для рэалізацыі праекта. На месцы сельскага клуба зробім велапаркоўкі, паставім абсталяванне безбар'ернага ўвахода, лаўкі і іншае. Работы збольшага будуць выкананыя сіламі жыхароў. Узаемадзеянне наладжана з Віцебскім райвыканкамам, Віцебскім раённым Саветам дэпутатаў, прадстаўнікамі малога бізнесу. Дагавор аб сумеснай рэалізацыі будзе заключаны з сектарам спорту і турызму Віцебскага райвыканкама».

Старшыня Крэмяніцкага сельскага Савета Зэльвенскага раёна Аляксандр ДЗЕРАЧЭНІК падзяліўся ініцыятывай «Адпачынак у Князева», што рэалізоўваецца ў аграгарадку з аднайменнай назвай. «На яго тэрыторыі добрая інфраструктура, аднак пяць гектараў паркавай зоны нагадвалі толькі прыродны ландшафт. Узнікла ідэя ператварыць яе ў месца адпачынку для жыхароў і гасцей Князева. Яны, дарэчы, гэта вельмі падтрымалі. Мы ўжо зрабілі першасныя работы. Пасля адкрыцця комплексу тут можна будзе праводзіць розныя святы: Дажынкі, Купалле і іншыя. На рэалізацыю праекта адводзім каля васьмі месяцаў і задзейнічаем прыкладна 15—20 тысяч долараў».

Таксама падчас семінара былі прадстаўлены праекты «Нас аб'яднаў Ясеневы гай», што будзе рэалізоўвацца ў аграгарадку Горы Краснапольскага раёна, «Адраджэнне гісторыка-культурнай каштоўнасці — парку XIX стагоддзя» ў аграгарадку Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна, «Дыялог гісторыі і мастацтва ў публічнай прасторы» ў Кобрыне, «Рэалізуем стратэгію разам! 2.0.» у вёсцы Здзітава Бярэзінскага раёна, «Тэрыторыя аб'яднання» ў Чавусах і іншыя.

Нагадаем, што праект «TANDEM» мае на мэце ўстойлівае супрацоўніцтва паміж грамадскімі аб'яднаннямі і мясцовымі органамі ўлады для актывізацыі ўдзелу грамадзян у мясцовым самакіраванні і развіцця мясцовых супольнасцяў у краіне. Праектныя заяўкі могуць датычыцца розных тэматычных напрамкаў: культуры, адукацыі, спорту, аграэкатурызму, экалогіі, сацыяльнай інфраструктуры, добраўпарадкавання, устойлівага развіцця і іншага. Тэрмін рэалізацыі праектаў складае 18 месяцаў — іх адкрыццё адбудзецца 31 кастрычніка. Сярэдні памер фінансавай падтрымкі праграмы штогод складае сем тысяч еўра. Абавязковай умовай рэалізацыі мініпраектаў з'яўляецца іх рэгістрацыя ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 13 лютага 2020 года.